БРЭСЦКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА
імя М. ГОРКАГА
АДДЗЕЛ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА

КАЛЯНДАР

знамянальных і памятных дат

2026

БРЭСТ, 2025

Складальнікі: Ю. М. Майкевіч
А. В. Пастыка

Рэдактары: Л. К. Кароль
А. С. Кузьміна

Адказны за выпуск А. Я. Стрыжэвіч

Каляндар знамянальных і памятных дат на 2026 год / Установа культуры «Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага», Аддзел бібліятэказнаўства ; складальнікі: Ю. М. Майкевіч, А. В. Пастыка ; рэдактары: Л. К. Кароль, А. С. Кузьміна. – Брэст, 2025. – 95 с.

224016, г. Брэст, бульвар Касманаўтаў, 48
Установа культуры «Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага»
Аддзел бібліятэказнаўства

+375 162 53 04 40
e-mail: brestrl@mail.ru

«Каляндар знамянальных і памятных дат на 2026 год», які створаны аддзелам бібліятэказнаўства Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага, уключае раздзелы:

1. **«Даты беларускага і краязнаўчага календара»**: уключаны юбілеі рэспубліканскага значэння ў галіне літаратуры і мастацтва; юбілеі знакавых падзей, дзяржаўныя, агульнарэспубліканскія, рэлігійныя святы, памятныя даты; памятныя даты вобласці; юбілеі дзеячаў, жыццё або дзейнасць якіх звязаны з Брэстчынай.
2. **«Даты российского и зарубежного календаря»**: уключаны найбольш значныя даты расійскага і замежнага календара; юбілеі паэтаў, пісьменнікаў, літаратуразнаўцаў, а таксама найбольш вядомых дзеячаў мастацтва, палітыкі і грамадства.
3. **«Книги-юбиляры»**.

Выкарыстаная літаратура:

Беларускі каляндар, 2026 год // Новыя кнігі: па старонках беларускага друку. – 2025. – № 8. – Дадатак (студзень – снежань).

Знаменательные даты, 2016 : универсальный энциклопедический календарь-журнал : для работников библиотек, школ и вузов, учреждений науки и культуры, любителей искусства и словесности. – Москва : Либер-Дом, 2015. – 752 с.

Знаменательные даты, 2021 : универсальный энциклопедический календарь-журнал : для работников библиотек, школ и вузов, учреждений науки и культуры, любителей искусства и словесности. – Москва : Либер-Дом, 2020. – 384 с.

Календарь знаменательных и памятных дат по истории Брестской области на 2026 год / составитель О. В. Сухаревич. – Брест : Государственный архив Брестской области, 2025. – 24 с.

Літаратурная карта Берасцейшчыны / Галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы Брэсцкага аблвыканкама ; рэдактар і ўкладальнік А. Крэйдзіч ; рэдакцыйны савет: Л. А. Цупрык (старшыня) [і інш.]. – Брэст : Брэсцкая друкарня, 2008. – 567 с.

Мастакі Брэстчыны : каталог / Грамадскае аб’яднанне «Беларускі саюз мастакоў» ; складальнік П. А. Рабаў. – Брэст : Брэсцкая друкарня, 2019. – 107 с.

Творчы партрэт пісьменніцкай суполкі : біябібліяграфічны даведнік Брэсцкага абласного аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі / складальнік Н. М. Парчук ; [пад рэдакцыяй Т. А. Дземідовіч]. – Брэст : Альтернатива, 2018. – 175 с.

Беларусь у асобах і падзеях : анлайн-энцыклапедыя. – Тэкст : электронны // Нацыянальная бібліятэка Беларусі : [сайт]. – URL: htpps://bis.nlb.by/ru (дата звароту: 21.07.2025).

ДАТЫ БЕЛАРУСКАГА і КРАЯЗНАЎЧАГА КАЛЕНДАРА

У 2026 ГОДЗЕ СПАЎНЯЕЦЦА:

925 гадоў з дня нараджэння **ЕФРАСІННІ** (ЕЎФРАСІННІ) **ПОЛАЦКАЙ** (свец. ПРАДСЛАВА; каля 1101 ці 1104, г. Полацк, Віцебская вобл. – 1173), полацкай князёўны, асветніцы і мецэнаткі, заснавальніцы жаночага і мужчынскага манастыроў, якія сталі цэнтрам асветы ў Полацкім княстве, ігуменні, першай жанчыны гэтага гістарычнага перыяду, кананізаванай у святыя

865 гадоў з часу стварэння **КРЫЖА ЕФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ** (1161), унікальнага твора старабеларускага эмальернага мастацтва, рэлігійнай і духоўнай святыні беларусаў, выраблена ў г. Полацку для царквы Святога Спаса па заказе прападобнай ігуменні Ефрасінні Полацкай майстрам Лазарам Богшам (арыгінал быў страчаны падчас Вялікай Айчыннай вайны)

750 гадоў з часу заснавання г. **КАМЯНЦА** (1276) валынскім князем Уладзімірам Васількавічам, цэнтра раёна Брэсцкай вобласці

750 гадоў з пачатку будавання **КАМЯНЕЦКАЙ ВЕЖЫ** (1276), помніка абарончага дойлідства, унесенага ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь

730 гадоў з дня нараджэння **АЛЬГЕРДА** (сына ГЕДЗІМІНА; 1296–1377), князя крэўскага і віцебскага, вялікага князя Вялікага Княства Літоўскага

630 з часу заснавання **ПІНСКАГА КАСЦЁЛА УНЕБАЎЗЯЦЦЯ ДЗЕВЫ МАРЫІ і КЛЯШТАРА ФРАНЦЫСКАНЦАЎ** (1396), помніка архітэктуры барока, унесенага ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь

580 гадоў з часу стварэння **БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКАГА ЛЕТАПІСУ 1446 г.**, першага агульнадзяржаўнага летапіснага зводу Вялікага Княства Літоўскага, прысвечанага гісторыі ўсходніх славян і Літвы, які хараналагічна ахоплівае перыяд ад сярэдзіны IX да сярэдзіны XV ст.

560 гадоў з часу першых звестак у гістарычных крыніцах аб **в. ДЗІВІН** (Кобрынскі р-н; 1466)

515 гадоў з часу прадастаўлення г. Брэсту правоў на **ПРАВЯДЗЕННЕ ДВУХ КІРМАШОЎ** у год (1511)

510 гадоў з часу першых звестак у гістарычных крыніцах аб **в. АСТРАМЕЧАВА** (Брэсцкі р-н; 1516)

500 гадоў з дня нараджэння **КАНСТАНЦІНА КАНСТАНЦІНАВІЧА АСТРОЖСКАГА** (каля 1526, г. Тураў, Гомельская вобл. – 1608), палітычнага і культурнага дзеяча Вялікага Княства Літоўскага, які выступаў супраць паланізацыі насельніцтва і пашырэння каталіцтва на Беларусі і Украіне

460 гадоў з часу існавання **БЕРАСЦЕЙСКАГА ВАЯВОДСТВА** (1566–1795), адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ў Вялікім Княстве Літоўскім з цэнтрам у г. Бярэсце (цяпер — г. Брэст)

460 гадоў з часу ўпамінання ў пісьмовых крыніцах **в. РЫТА МАЛАЯ** (цяпер — г. МАЛАРЫТА; 1566), цэнтра раёна Брэсцкай вобласці

440 гадоў з часу заснавання **ДАВЫД-ГАРАДОЦКАГА МАЙАРАТА** (1586) князёў Радзівілаў з рэзідэнцыяй у в. Манькавічы

435 гадоў з часу зацвярджэння **НІКОЛЬСКАГА ПРАВАСЛАЎНАГА БРАЦТВА** пры царкве Святога Мікалая і адкрыцця першай брацкай школы (г. Брэст; 1591)

430 гадоў з часу выдання **«АЗБУКІ» ЛАЎРЭНЦІЯ ЗІЗАНІЯ** («НАУКА КУ ЧИТАНЮ И РОЗУМЕНЮ ПИСМА СЛОВЕНСКАГО, ТУ ТЫЖ О СВЯТОЙ ТРОИЦИ И О ВЪЧЛОВЕЧЕНИИ ГОСПОДНИ»; 1596), першага на Беларусі і Украіне падручніка для пачатковага навучання грамаце

430 гадоў з часу заснавання **ПІНСКА-ТУРАЎСКАЙ ГРЭКА-КАТАЛІЦКАЙ ЕПАРХІІ** (1596, Пінскі пав. – 1795), адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі грэка-каталіцкай (уніяцкай) царквы ў Беларусі

375 гадоў з дня нараджэння **ІЛЛІ ФЁДАРАВІЧА КАПІЕВІЧА** (КАПІЕЎСКАГА; 1651, Брэстчына ці Міншчына – 1714), асветніка, перакладчыка, выдаўца, літаратара

230 гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА МІХАЙЛАВІЧА БАГАТКЕВІЧА** (1796, Віцебская губ. – 1831[?]), кнігазнаўца, бібліятэкара, бібліёграфа, педагога

225 гадоў з часу ўваходжання **г. БРЭСТА ў СКЛАД ГРОДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ** (1801) Расійскай імперыі

225 гадоў з дня нараджэння **ТАМАША КУРГАНОВІЧА** (1801, г. Брэст – 1865), педагога, мовазнаўца

205 гадоў з дня нараджэння **КСЕНАФОНТА АНТОНАВІЧА ГАВОРСКАГА** (1821–1871), вучонага-гісторыка, археолага, які даследаваў курганы на Полаччыне і ў Лепельскім павеце, выдаўца, аўтара прац пра ўвядзенне хрысціянства ў Полацкім княстве, даследчыка гісторыі права, лёсу кальвінізму на Беларусі

205 гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА МАКСІМАВІЧА СЕМЯНТОЎСКАГА** (СЕМЯНТОЎСКАГА-КУРЫЛЫ; 1821–1893), археолага, краязнаўца, этнографа, аўтара шматлікіх прац і публікацый, большасць з якіх прысвечаны Беларусі, пераважна Віцебшчыне

205 гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА АНДРЭЕВІЧА СТАНКЕВІЧА** (у ман. АНАТОЛІЯ; 1821, Міншчына – 1903), праваслаўнага царкоўнага дзеяча Беларусі, гісторыка, публіцыста

190 гадоў з часу ўстаноўкі **МЕЖАВОГА ЗНАКА** (1836), які падзяліў землі г. Брэста і Брэсцкай крэпасці

190 гадоў з часу заснавання **БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ АКАДЭМІІ** (цяпер — УА «БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ОРДЭНАЎ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ і ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЯ АКАДЭМІЯ»), першай на тэрыторыі Беларусі і Расіі вышэйшай сельскагаспадарчай школы (г. Горкі, Магілёўская вобл.; 1836)

185 гадоў з часу пабудавання **КАРАЛЕЎСКАГА КАНАЛА** (1841), які злучае раку Мухавец (басейн Буга) з ракой Пінай (басейн Прыпяці)

175 гадоў з дня нараджэння **ІВАНА ПАЎЛАВІЧА АЗЁМШЫ** (АЗЕМШЫ; 1851, Петрыкаўскі р-н, Гомельская вобл. – 1916), беларускага народнага казачніка

170 гадоў з часу пабудавання **КАФЕДРАЛЬНАГА КАСЦЁЛА** ў г. Брэсце (цяпер — КАСЦЁЛ УЗВЫШЭННЯ СВЯТОГА КРЫЖА; 1856)

165 гадоў з дня нараджэння **ФРАНЦІШКА БРУЗДОВІЧА** (1861, в. Бродніца, Іванаўскі р-н – 1912), мастака ў галіне станковага і дэкаратыўна-прыкладнога жывапісу, аўтара роспісаў касцёлаў у Польшчы і Беларусі

150 гадоў з часу заснавання **«ЛІДСКАГА ПІВА»** (1876), адкрытага акцыянернага таварыства па вытворчасці піва і напояў

140 гадоў з часу пабудавання **БРЭСЦКАГА ЧЫГУНАЧНАГА ВАКЗАЛА** (1886), помніка архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю, унесенага ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь

140 гадоў з дня нараджэння **КАСЬЯНА ВЯСЁЛАГА** (сапр. ВІКЕНЦІЯ ІОСІФАВІЧА АЎДЗЕЯ; 1886 ці 1891, Вілейскі пав. – 1916), пісьменніка, аўтара вершаў, апавяданняў, нататкаў

120 гадоў з дня нараджэння **ЭДУАРДА УЛАДЗІСЛАВАВІЧА ГАЛУБКА** (1906, г. Мінск – 1942 ці 1943), фальклярыста, літаратуразнаўца, літаратурнага і тэатральнага крытыка

120 гадоў з часу пабудавання на сродкі прыхажан **СВЯТА-МІКАЛАЕЎСКАЙ ЦАРКВЫ** ў г. Брэсце (1906)

120 гадоў з часу закладкі **ЛІБАЎСКАГА ПАРКУ** (цяпер — БРЭСЦКАЕ КУП «ПАРК КУЛЬТУРЫ і АДПАЧЫНКУ»; 1906)

105 гадоў з часу адкрыцця **ДЗЯРЖАЎНАЙ ГІМНАЗІІ імя КАРАЛЯ УЛАДЗІСЛАВА ЯГЕЛЛЫ** ў г. Лунінцы (1921)

105 гадоў з часу адкрыцця **БЕЛАРУСКАГА МУЗЕЯ імя І. ЛУЦКЕВІЧА ў ВІЛЬНІ** (ВІЛЕНСКІ БЕЛАРУСКІ ГІСТОРЫКА-ЭТНАГРАФІЧНЫ МУЗЕЙ імя І. ЛУЦКЕВІЧА), адной з галоўных навуковых і асветніцкіх устаноў у гісторыі Беларусі, большасць збораў якой цяпер зберагаюцца ў буйнейшых музеях Літвы і Беларусі (Літва; 1921–1945)

100 гадоў з часу адкрыцця **ПОЛЬСКАЙ МУЖЧЫНСКАЙ ГІМНАЗІІ** пры духоўнай семінарыі ў г. Пінску (1926)

100 гадоў з часу адкрыцця **ПАЛЕСКАГА МУЗЕЯ** ў г. Пінску (цяпер — ДУ «МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА ПАЛЕССЯ»; 1926)

100 гадоў з часу адкрыцця **ТЫПАГРАФІІ ГОЛЬДБЕРГА** ў г. Пінску (1926)

95 гадоў з часу адкрыцця **ДЗЯРЖАЎНАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ШКОЛЫ ў в. ДУБІЦА** Брэсцкага павета (1931)

90 гадоў з дня нараджэння **ДЗМІТРЫЯ МІКАЛАЕВІЧА КРАЎЧУКА** (1936, в. Харава, Пружанскі р-н), вучонага-геафізіка, матэматыка, кандыдата фізіка-матэматычных навук

80 гадоў з пачатку выдання дзяржаўнага (нацыянальнага) бібліяграфічнага паказальніка **«БЕЛАРУСЬ у СУСВЕТНЫМ ДРУКУ»** (г. Мінск; 1946)

80 гадоў з часу стварэння **ААТ «БРЭСТСЕЛЬМАШ»**, аднаго з вядучых вытворцаў па выпуску спецыяльнага абсталявання для сельскай гаспадаркі (1946)

80 гадоў з часу стварэння **АРЦЕЛІ «8 САКАВІКА»** ў г. Пінску (1946), аднаго з буйнейшых вытворцаў народных мастацкіх вырабаў, у тым ліку народных касцюмаў (цяпер — УП «ПІНСКАЯ ФАБРЫКА МАСТАЦКІХ ВЫРАБАЎ „КРЫНІЦА ПАЛЕССЯ“»)

80 гадоў з часу стварэння **ПІНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА АГРАРНА-ТЭХНІЧНАГА КАЛЕДЖА імя А. Я. КЛЯШЧОВА** (1946)

75 гадоў з часу стварэння **ААТ «БРЭСТГАЗААПАРАТ»** (1951), беларуска-расійскага сумеснага прадпрыемства па выпуску кухонных пліт, лаўрэата Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці (2000, 2003, 2019, 2021)

70 гадоў з часу заснавання **ПІНСКАГА ДОСЛЕДНА-МЕХАНІЧНАГА ЗАВОДА** (1956), адкрытага акцыянернага таварыства, прадпрыемства па вытворчасці станкоў, механізмаў, помпаў і помпавага абсталявання, сродкаў металаапрацоўкі, металаканструкцый, цеплаабменных установак

55 гадоў з часу заснавання **БЕЛАРУСКАЙ БІБЛІЯТЭКІ і МУЗЕЯ імя ФРАНЦІШКА СКАРЫНЫ ў ЛОНДАНЕ** (1971), грамадска-культурнай установы беларусаў у Вялікабрытаніі, адзінай бібліятэкі за межамі Беларусі, якая спецыялізуецца выключна на беларускай тэматыцы

30 гадоў з часу правядзення міжнароднага фестывалю духавой музыкі **«БЕЛАРУСКІЯ ФАНФАРЫ»** (г. Баранавічы; 1996)

30 гадоў з пачатку выдання навукова-папулярнага, даведачнага, нарматыўнага вытворча-практычнага часопіса **«БІБЛІЯТЭЧНЫ СВЕТ»** (г. Мінск; 1996)

30 гадоў з часу заснавання навукова-метадычнага і публіцыстычнага часопіса **«ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА»** (г. Мінск; 1996)

30 гадоў з пачатку правядзення фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі **«ДАЖЫНКІ»** (г. Столін; 1996)

СТУДЗЕНЬ

105 гадоў з часу заснавання дзяржаўнага выдавецтва **«БЕЛАРУСЬ»**, рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства (г. Мінск; 1921)

100 гадоў з дня нараджэння **ПЯТРА ІВАНАВІЧА КУПРЫЯНАВА** (1926, г. Жодзіна, Мінская вобл. – 1944), удзельніка партызанскага руху, вызвалення Беларусі і Прыбалтыкі ў час Вялікай Айчыннай вайны, Героя Савецкага Саюза (1945)

50 гадоў з часу ўвода ў эксплуатацыю **ДРАБІЛЬНА-САРТЫРОВАЧНАГА ЗАВОДА «МІКАШЭВІЧЫ»** (цяпер — РУПП «ГРАНІТ»; Лунінецкі р-н; 1976)

1 і 2 **НОВЫ ГОД**

1 **165** гадоў з дня нараджэння **ЯЎХІМА ФЁДАРАВІЧА КАРСКАГА** (1861, в. Лаша, Гродзенскі пав. – 1931), філолага-славіста, заснавальніка беларускага навуковага мовазнаўства і літаратуразнаўства, этнографа, фальклярыста, палеографа, педагога, акадэміка Пецярбургскай акадэміі навук, правадзейнага члена Інбелкульта, Чэшскай акадэміі навук

1 **105** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА ПРАКОПАВІЧА БЕЛАВУСАВА** (1921, Шумілінскі р-н, Віцебская вобл. – 2006), мастака кіно, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР (1973), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР (1974)

1 **90** гадоў з дня нараджэння **АНАТОЛЯ ПАЎЛАВІЧА КУДРАЎЦА** (1936, Клічаўскі р-н, Магілёўская вобл. – 2014), пісьменніка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1986), кавалера ордэна Дружбы народаў

1 **70** гадоў з дня нараджэння **ГАЛІНЫ СТАНІСЛАВАЎНЫ ГАРАДКО** (1956, Ляхавіцкі р-н), кандыдата філалагічных навук, дацэнта, аўтара шматлікіх вучэбна-метадычных дапаможнікаў па беларускай літаратуры

1 **65** гадоў з часу адкрыцця **БРЭСЦКАЙ АБЛАСНОЙ ДЗІЦЯЧАЙ БІБЛІЯТЭКІ** (цяпер — ДЗІЦЯЧЫ АДДЗЕЛ, ЮНАЦКІ АДДЗЕЛ УСТАНОВЫ КУЛЬТУРЫ «БРЭСЦКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА імя М. ГОРКАГА»; 1961)

2 **90** гадоў з дня нараджэння **АНТОНА РЫГОРАВІЧА НАВУМАЎЦА** (1936, в. Рудка, Пінскі р-н – 2025), вучонага-фізіка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР (1988)

2 **85** гадоў з дня нараджэння **МІХАСЯ** (МІХАІЛА МІКАЛАЕВІЧА)

ЗАРЭМБЫ (1941, Лагойскі р-н, Мінская вобл. – 2002), пісьменніка, перакладчыка, аўтара кніг аповесцей і апавяданняў для дзяцей

3 **205** гадоў з дня нараджэння **МІХАІЛА СЯРГЕЕВІЧА БАШЫЛАВА** (1821, Жлобінскі р-н, Гомельская вобл. – 1870), мастака, ілюстратара

3 **85** гадоў з дня нараджэння **СЦЯПАНА ПАЎЛАВІЧА НЕФІДОВІЧА** (1941, в. Лахаўка, Лунінецкі р-н), педагога, краязнаўца, пісьменніка, паэта, аўтара зборнікаў мастацкай прозы, паэзіі, прац па краязнаўстве і фальклоры Лунінеччыны

3 **75** гадоў з дня нараджэння **РАСЦІСЛАВА РЫГОРАВІЧА КУЗЬМІЧА** (1951, в. Велямічы, Столінскі р-н), прафесара, доктара ветэрынарных навук, аўтара прац па распрацоўцы і ўдасканаленні спосабаў лячэння і прафілактыкі акушэрска-гінекалагічных прыёмаў павышэння апладняльнасці жывёл, выдатніка адукацыі Беларусі (2010)

3 **75** гадоў з дня нараджэння **ВАЛЯНЦІНЫ МІХАЙЛАЎНЫ КУКСА** (1951, в. Гнеўчыцы, Іванаўскі р-н – 2014), пісьменніцы, празаіка, педагога, лаўрэата прэміі «Берасцейская зорка»

4 **ДЗЕНЬ БАНКАЎСКІХ і ФІНАНСАВЫХ РАБОТНІКАЎ** *(першая нядзеля студзеня)*

5 **ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ**

7 **РАСТВО ХРЫСТОВА** *(праваслаўнае Раство)*

7 **125** гадоў з дня нараджэння **ІОСІФА МАЙСЕЕВІЧА РАЕЎСКАГА** (1901–1972), рэжысёра тэатра, педагога, акцёра, заслужанага артыста РСФСР (1948), заслужанага дзеяча мастацтваў РСФСР (1954), народнага артыста БССР (1955) і СССР (1968), кавалера ордэна «Знак Пашаны» (1938), кавалера ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга (1940, 1948)

7 **50** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА ВІКТАРАВІЧА КУР'ЯНОВІЧА** (1976, г. Баранавічы), вучонага-гісторыка, які цікавіцца праблемамі гістарычнай навукі, вывучае гісторыю штодзённасці, гістарычную антрапалогію

8 **135** гадоў з дня нараджэння **БРАНІСЛАВЫ ФАМІНІЧНЫ НІЖЫНСКАЙ** (1891, г. Мінск – 1972), балетмайстра, педагога, аднаго з рэфарматараў харэаграфіі XX ст.

8 **90** гадоў з дня нараджэння **ГЕНАДЗЯ АЛЯКСАНДРАВІЧА КАХАНОЎСКАГА** (1936, Маладзечанскі р-н, Мінская вобл. – 1994), вучонага-гісторыка, археолага, краязнаўца, фальклярыста, літаратуразнаўца, аўтара літаратурна-краязнаўчых нарысаў, кніг па гісторыі гарадоў Беларусі

8 **75** гадоў з дня нараджэння **ГЕНАДЗЯ ІВАНАВІЧА ЖУРАЎСКАГА** (1951, Лунінецкі р-н), вучонага ў галіне цеплафізікі, доктара тэхнічных навук

9 **135** гадоў з дня нараджэння **НАВУМА БАРЫСАВІЧА** (НОХУМА БОРУХАВІЧА) **ЛОЙТАРА** (1891, Расія – 1966), рэжысёра, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР (1945), заслужанага дзеяча мастацтваў РСФСР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР (1946)

11 **105** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА АЛЯКСАНДРАВІЧА БЯЛОВА** (1921, Расія – 1985), акцёра, заслужанага артыста БССР (1977)

12 **445** гадоў з часу атрымання **г. ПІНСКАМ ГРАМАТЫ на МАГДЭБУРГСКАЕ ПРАВА** (1581)

12 **85** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА ГЕОРГІЕВІЧА МУЛЯВІНА** (1941, Расія – 2003), артыста эстрады, кампазітара, стваральніка і мастацкага кіраўніка Беларускага дзяржаўнага ансамбля «Песняры», заслужанага артыста БССР (1973), народнага артыста БССР (1979) і СССР (1991), заслужанага дзеяча культуры Польшчы (1980), лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола БССР (1976), кавалера ордэна Францыска Скарыны (2001)

12 **75** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСЕЯ МІХАЙЛАВІЧА ЛІТВІНА** (1951, в. Семігосцічы, Столінскі р-н), вучонага-гісторыка, прафесара, доктара гістарычных навук, аўтара прац па ваеннай гісторыі Беларусі перыяду Першай і Другой сусветных войнаў

15 **105** гадоў з пачатку выхаду газеты **«БЕЛОРУССКАЯ НИВА»** (раней — «Белорусская деревня», «Беларуская вёска», «Калгаснік Беларусі», «Сельская газета» і інш.; г. Мінск; 1921)

15 **90** гадоў з дня нараджэння **ЯНКІ** (ІВАНА ДАНІЛАВІЧА) **СІПАКОВА** (1936, Аршанскі р-н, Віцебская вобл. – 2011), пісьменніка, перакладчыка, заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь (1997), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1976)

15 **75** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ МІКАЛАЕВІЧА КАЛІНКОВІЧА** (сапр. КАЛЯНКОВІЧА; 1951, в. Цна, Лунінецкі р-н – 1990), пісьменніка, літаратуразнаўца, крытыка, публіцыста, даследчыка беларуска-рускіх, беларуска-туркменскіх літаратурных сувязей

16 **35** гадоў з пачатку выдання газеты аб спорце **«ПРЕССБОЛ»** (г. Мінск; 1991)

17–18 **100** гадоў з часу правядзення **ПЕРШАГА З'ЕЗДУ ДАСЛЕДЧЫКАЎ БЕЛАРУСКАЙ АРХЕАЛОГІІ і АРХЕАГРАФІІ** (г. Мінск; 1926)

17 **65** гадоў з пачатку дзейнасці **НОВА-БЯРОЗАЎСКАГА ВАПНАВАГА ЗАВОДА** (цяпер — ААТ «БЯРОЗАЎСКІ КАМБІНАТ СІЛІКАТНЫХ ВЫРАБАЎ»; 1961)

18 **90** гадоў з дня нараджэння **ВАСІЛЯ СЯРГЕЕВІЧА СЁМУХІ**

(1936, Пружанскі р-н – 2019), перакладчыка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь імя Якуба Коласа (1992)

18 **65** гадоў з дня нараджэння **ВАЛЕРЫЯ ЯЎГЕНАВІЧА КАВАЛЬЧУКА** (1961, г. Брэст), жывапісца, педагога

19 **ДЗЕНЬ РАТАВАЛЬНІКА**

19 **95** гадоў з дня нараджэння **НАТАЛЛІ МІКАЛАЕЎНЫ ПАПЛАЎСКАЙ** (1931, Расія), мастака ў галіне станковай і кніжнай графікі, лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола БССР (1970), узнагароджанай медалём Францыска Скарыны (2001)

20 **100** гадоў з часу адкрыцця **СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ШКОЛЫ** ў в. Дубае Пінскага павета (1926)

21 **ДЗЕНЬ ІНЖЫНЕРНЫХ ВОЙСКАЎ**

21 **70** гадоў з дня нараджэння **МАРЫНЫ БРАНІСЛАВАЎНЫ КНЯЗЕВАЙ** (1956, г. Мінск – 2018), мастака дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (мастацкае шкло), жывапісца

22 **ДЗЕНЬ ДЫПЛАМАТЫЧНАГА РАБОТНІКА**

22 **100** гадоў з дня нараджэння **ІЗЯСЛАВА** (свец. ІВАНА (ЯНА) БРУЦКАГА; 1926, в. Белавуша, Столінскі р-н – 2007), рэлігійнага і грамадскага дзеяча беларускага замежжа (Канада, ЗША), іерарха Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы

22 **65** гадоў з дня нараджэння **ГАЛІНЫ ІВАНАЎНЫ ПАСОХІНАЙ** (1961, г. Брэст), вучонага-гісторыка, кандыдата гістарычных навук, дацэнта, аўтара прац па праблемах сучаснай гісторыі краін Азіі і Афрыкі

23 **120** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСЕЯ ІЛЬЧА ЗОЛАВА** (1906, г. Пінск – 1989), партыйнага і дзяржаўнага дзеяча БССР

24 **95** гадоў з дня нараджэння **МІХАСЯ** (МІХАІЛА ІОСІФАВІЧА) **МУШЫНСКАГА** (1931, Быхаўскі р-н, Магілёўская вобл. – 2018), літаратуразнаўца, тэкстолага, крытыка, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1980)

24 **85** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА АЛЯКСАНДРАВІЧА АЛОНЦАВА** (1941, г. Брэст – 2013), мастака, педагога, аўтара прац у станковай графіцы, акварэлі

24 **75** гадоў з дня нараджэння **МІХАСЯ** (МІХАІЛА ПАЎЛАВІЧА) **ПАЗНЯКОВА** (1951, Быхаўскі р-н, Магілёўская вобл.), пісьменніка, многія вершы якога пакладзены на музыку, перакладчыка, мовазнаўца, журналіста, члена-карэспандэнта Пятроўскай акадэміі навук і мастацтваў, лаўрэата літаратурных прэмій імя П. Броўкі, Я. Маўра, В. Віткі, узнагароджанага медалём Францыска Скарыны (2011)

24 **75** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА МІХАЙЛАВІЧА ХОМІЧА** (1951, в. Кунаховічы, Камянецкі р-н), вучонага-юрыста, доктара юрыдычных навук (1998), прафесара (2000), заслужанага

юрыста Рэспублікі Беларусь (2011)

25 **ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАЙ НАВУКІ** *(апошняя нядзеля студзеня)*

26 **70** гадоў з дня нараджэння **АНАТОЛЯ ЮЛІЯНАВІЧА КАЖАНОЎСКАГА** (1956, Столінскі р-н), мастака, аўтара прац у станковай і кніжнай графіцы

28 **245** гадоў з дня нараджэння **ЮЗАФА ДАШЧАНСКАГА** (1781, г. Вільня – 1844), піяніста, кампазітара, дырыжора, педагога

28 **110** гадоў з дня нараджэння **ПАЎЛА ВАСІЛЬЕВІЧА ПРАНЯГІНА** (1916, Расія – 1997), удзельніка партызанскага руху на тэрыторыі Брэсцкай вобласці падчас Вялікай Айчыннай вайны

29 **70** гадоў з дня нараджэння **ТАМАРЫ УЛАДЗІМІРАЎНЫ ДЗЯНІСАВАЙ** (1956, Жыткавіцкі р-н, Гомельская вобл.), мастака ў тэхніцы акварэльнага і станковага жывапісу

29 **35** гадоў з часу заснавання **АКАДЭМІІ КІРАВАННЯ ПРЫ ПРЭЗІДЭНЦЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**, дзяржаўнай вышэйшай навучальнай установы па падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі кадраў органаў дзяржаўнага кіравання, кіруючых кадраў і спецыялістаў народнай гаспадаркі (г. Мінск; 1991)

30 **105** гадоў з дня нараджэння **ІВАНА ПЯТРОВІЧА ШАМЯКІНА** (1921, Добрушскі р-н, Гомельская вобл. – 2004), пісьменніка, сцэнарыста, драматурга, народнага пісьменніка БССР (1972), дзяржаўнага і грамадскага дзеяча, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР (1951), Літаратурнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1959), Дзяржаўнай прэміі БССР (1968, 1982), Героя Сацыялістычнай Працы (1981), Прэміі Саюзнай Дзяржавы Беларусі і Расіі (2002), кавалера ордэна Леніна (1981), узнагароджанага медалём Францыска Скарыны

31 **130** гадоў з дня нараджэння **СОФ'І АЛЯКСАНДРАЎНЫ ЯНОЎСКАЙ** (дзяв. НЕЙМАРК; 1896, г. Пружаны – 1966), вучонага-філосафа, педагога, логіка і матэматыка, стваральніка савецкай школы філасофіі матэматыкі, удзельніка Грамадзянскай вайны, кавалера ордэна Леніна

31 **100** гадоў з дня нараджэння **МІХАІЛА КАНСТАНЦІНАВІЧА МІЦКЕВІЧА** (1926, г. Мінск – 2004), вучонага ў галіне тэхналогіі апрацоўкі матэрыялаў, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР (1980), майстра спорту (стэндавая стральба), сына Якуба Коласа

ЛЮТЫ

55 гадоў з часу стварэння **БРЭСЦКАГА КАМБІНАТА БУДАЎНІЧЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ** (1971), адкрытага акцыянернага таварыства, лаўрэата Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці (2003)

50 гадоў з часу адкрыцця **КІНАТЭАТРА «БЕЛАРУСЬ»** (г. Брэст; 1976)

1 **130** гадоў з дня нараджэння **МІХАІЛА СЯРГЕЕВІЧА ФІЛІППОЎСКАГА** (1896, г. Баранавічы – 1956), ваеннага дзеяча, генерал-лейтэнанта, удзельніка Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, кавалера ордэна Чырвонага Сцяга, ордэна Леніна

1 **80** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА МАІСЕЕВІЧА ЛІЎШЫЦА** (1946, Расія), літаратуразнаўца, філосафа, публіцыста, педагога, гісторыка, этнографа, кандыдата філасофскіх навук (1980)

2 **490** гадоў з дня нараджэння **ПЯТРА СКАРГІ** (ПАВЕНСКАГА; 1536, Польшча – 1612), царкоўнага і палітычнага дзеяча Рэчы Паспалітай, пачынальніка польскай аратарскай прозы, заснавальніка і першага рэктара Віленскай езуіцкай акадэміі (цяпер — Віленскі ўніверсітэт)

4 **105** гадоў з пачатку дзейнасці **ПАЛЕСКАГА ВАЯВОДСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ**, адміністратыўнага органа ўлады на тэрыторыі Палескага ваяводства (1921)

5 **50** гадоў з часу прыняцця рашэння аб стварэнні **ФАБРЫКІ МАРОЖАНАГА** (1976) на базе Брэсцкага гармалзавода (цяпер — ААТ «БРЭСЦКАЕ МАРОЖАНАЕ»)

7 **480** гадоў з дня нараджэння **ФЁДАРА МІХАЙЛАВІЧА ЕЎЛАШОЎСКАГА** (ЕЎЛАШЭЎСКАГА; 1546, г. Ляхавічы – пасля 1616 ці 1-я пал. 1619), грамадскага дзеяча, пісьменніка-мемуарыста

7 **145** гадоў з дня нараджэння **РАМУАЛЬДА АЛЯКСАНДРАВІЧА ЗЯМКЕВІЧА** (1881, Польшча – 1943 ці 1944), бібліёграфа, бібліяфіла, этнографа, публіцыста, гісторыка беларускай літаратуры

7–11 **100** гадоў з часу правядзення **ПЕРШАГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА КРАЯЗНАЎЧАГА З'ЕЗДУ** (г. Мінск; 1926)

7 **80** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА МІХАЙЛАВІЧА ТАПАРОВА** (1946, г. Баранавічы), ваеннага дзеяча, генерала арміі

7 **60** гадоў з часу адкрыцця **БРЭСЦКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ПАЛІТЭХНІЧНАГА КАЛЕДЖА** (1966), філіяла ўстановы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт»

8 **140** гадоў з дня нараджэння **ВАСІЛЯ ДАНІЛАВІЧА ДРУШЧЫЦА** (ДРУЖЧЫЦА; 1886, Бярозаўскі р-н – 1937), педагога, вучонага-гісторыка, даследчыка гісторыі Беларусі эпохі феадалізму, гісторыі беларускага кнігадрукавання

8 **105** гадоў з дня нараджэння **ІВАНА ПАЎЛАВІЧА МЕЛЕЖА** (1921, Хойніцкі р-н, Гомельская вобл. – 1976), пісьменніка, грамадскага дзеяча, народнага пісьменніка БССР (1972), лаўрэата

Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа (1962), Ленінскай прэміі (1972), Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1976), кавалера ордэна «Знак Пашаны» (1955), удзельніка Вялікай Айчыннай вайны

9 **125** гадоў з дня нараджэння **ВІКТАРА ПАЎЛАВІЧА ПУГАНАВА** (1901, Расія – 1941), удзельніка абароны г. Брэста ў Вялікую Айчынную вайну, генерал-маёра, кавалера ордэна Чырвонага Сцяга, ордэна Айчыннай вайны I ступені

9 **75** гадоў з дня нараджэння **ВІКТАРА АНАТОЛЬЕВІЧА ФЯДОСІКА** (1951, Лунінецкі р-н), вучонага-гісторыка, аўтара даследаванняў па гісторыі Рымскай імперыі, антычнага хрысціянства і культуры, сярэдневяковай гісторыі каталіцкай царквы, аўтара падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі для сярэдніх школ, лаўрэата прэміі БДУ імя акадэміка У. І. Пічэты (2003), выдатніка адукацыі Рэспублікі Беларусь (2009)

10 **75** гадоў з дня нараджэння **МАРЫІ ПЯТРОЎНЫ ЖЫГАЛАВАЙ** (1951, в. Збураж, Маларыцкі р-н), літаратуразнаўца, педагога, метадыста, доктара педагагічных навук, навукоўца, заслужанага настаўніка БССР (1987)

12 **95** гадоў з дня нараджэння **ПАЎЛА НЕСЦЕРАВІЧА ПАНАСЮКА** (1931–2016), дырэктара Мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» (1981–1996), старшыні савета ветэранаў Ленінскага р-на г. Брэста (2002–2014)

14 **125** гадоў з дня нараджэння **ПАЎЛА ПЯТРОВІЧА БУЦЬКО** (1901, Пружанскі р-н – 1986), дзеяча рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, рэвалюцыянера-інтэрнацыяналіста

14 **70** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА ІВАНАВІЧА ЯГОЎДЗІКА** (ЯГАЎДЗІКА; 1956, Слонімскі р-н, Гродзенская вобл.), пісьменніка, драматурга, літаратурнага крытыка, перакладчыка, лаўрэата прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (1993), Літаратурнай прэміі імя Я. Маўра (1994)

15 **ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ ВОІНАЎ-ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТАЎ**

15 **130** гадоў з дня нараджэння **ВАЛЯР'ЯНА ВАЛЯР'ЯНАВІЧА КАЛІНОЎСКАГА** (1896, Расія – 1941), спевака, артыста оперы (барытон), заслужанага артыста БССР (1940)

15 **125** гадоў з дня нараджэння **СЯРГЕЯ АНТОНАВІЧА БАБРУКА** (1901, в. Шубічы, Пружанскі р-н – 1962), ваеннага дзеяча, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, генерал-лейтэнанта інжынерна-тэхнічнай службы, Героя Савецкага Саюза (1944), кавалера ордэна Леніна (1944, 1945), ордэна Чырвонага Сцяга (1943, 1944, 1950), ордэна Айчыннай вайны I ступені (1943)

15 **95** гадоў з дня нараджэння **ГЕОРГІЯ ГЕОРГІЕВІЧА ПАПЛАЎСКАГА** (1931, Украіна – 2017), графіка, жывапісца,

народнага мастака Беларусі (1997), заслужанага дзеяча мастацтваў БССР (1977), лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола БССР (1970), Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры (2002), кавалера ордэна Дружбы народаў (1986)

17 **85** гадоў з дня нараджэння **КАСТУСЯ** (КАНСТАНЦІНА ФЁДАРАВІЧА) **ЖМІНЬКО** (1941, в. Пугачова, Брэсцкі р-н – 2015), паэта, мастака

17 **75** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА ДЗМІТРЫЕВІЧА ТУЛУПАВА** (1951, г. Брэст), мастака-жывапісца, педагога

17 **65** гадоў з дня нараджэння **КАНСТАНЦІНА ГАЎРЫЛАВІЧА ВАШЧАНКІ** (1961, Малдова), мастака-графіка, лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва (2016)

17 **40** гадоў з часу стварэння **«БРЭСТМАШ»** (1986), адкрытага акцыянернага таварыства ў складзе холдынга «БЕЛАЎТАМАЗ» па вытворчасці абсталявання для харчовай прамысловасці

19 **105** гадоў з дня нараджэння **ЯРАСЛАВА АНТОНАВІЧА ВАШЧАКА** (1921, Украіна – 1989), дырыжора, народнага артыста СССР (1979), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР (1990, пасмяротна)

21 **ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ ЗЕМЛЕЎПАРАДКАВАЛЬНАЙ і КАРТОГРАФА-ГЕАДЭЗІЧНАЙ СЛУЖБЫ**

21 **40** гадоў з часу стварэння **РУЖАНСКАЙ ПУШЧЫ**, біялагічнага заказніка рэспубліканскага значэння (Пружанскі р-н; 1986)

23 **ДЗЕНЬ АБАРОНЦАЎ АЙЧЫНЫ і УЗБРОЕНЫХ СІЛ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

23 **135** гадоў з дня нараджэння **МІХАЙЛЫ** (МІХАІЛА МІКАЛАЕВІЧА) **ПІЯТУХОВІЧА** (1891, Сенненскі р-н, Віцебская вобл. – 1937), крытыка, літаратуразнаўца, педагога, заснавальніка беларускай літаратурнай крытыкі

24 **105** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА ЯКАЎЛЕВІЧА КАРПАВА** (1921, Расія – 2011), рэжысёра, заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, кавалера ордэна Чырвонага Сцяга, ордэна Чырвонай Зоркі

24 **55** гадоў з часу стварэння дзіцячай юнацкай спартыўнай школы па акадэмічным і байдарачным веславанні **ДСТ «СПАРТАК»** (г. Брэст; 1971)

25 **120** гадоў з дня нараджэння **ПАЎЛА ІОСІФАВІЧА КАРУЗЫ** (1906, Докшыцкі р-н – 1988), грамадска-палітычнага і культурнага дзеяча, кампазітара, музыказнаўца, фальклярыста, дырыжора

25 **60** гадоў з часу стварэння **ВА «БЕЛАРУСНАФТА»**, рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства па здабычы і перапрацоўцы нафты і газу ў складзе канцэрна «Белнафтахім»

(г. Гомель; 1966)

28 **60** гадоў з дня нараджэння **АЛЕСЯ** (АЛЯКСАНДРА МІКАЛАЕВІЧА) **БАДАКА** (1966, в. Туркі, Ляхавіцкі р-н), паэта, празаіка, публіцыста, літаратурнага крытыка, лаўрэата рэспубліканскай літаратурнай прэміі «Залаты Купідон» (2008), Міждзяржаўнай прэміі СНД «Зоркі Садружнасці» (2014), кавалера ордэна Францыска Скарыны (2020)

САКАВІК

410 гадоў з пачатку дзейнасці **МАГІЛЁЎСКАЙ БРАЦКАЙ ДРУКАРНІ** (1616–1713), кнігавыдавецкага прадпрыемства Магілёўскага праваслаўнага брацтва, буйнейшага цэнтра беларускага кірылічнага кнігадрукавання

70 гадоў з часу стварэння на базе ліцейна-механічнай вытворчасці райкамбіната **ІНСТРУМЕНТАЛЬНАГА ЗАВОДА** ў г. Кобрыне (цяпер — ААТ «КОБРЫНСКІ ІНСТРУМЕНТАЛЬНЫ ЗАВОД „СІТОМА“»; 1961)

35 гадоў з часу заснавання **МАШЫНАБУДАЎНІЧАГА ПРАДПРЫЕМСТВА «КОМПО»**, таварыства абмежаванай адказнасці, лаўрэата Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці 2011 г. (г. Брэст; 1991)

1 **460** гадоў з часу ўступлення ў законную сілу **СТАТУТА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА 1566 г.** (1566–1588), зводу законаў феадальнага права, Другога статута Вялікага Княства Літоўскага

1 **100** гадоў з дня нараджэння **БАРЫСА ВАСІЛЬЕВІЧА СТРАЛЬЦОВА** (1926, Быхаўскі р-н, Магілёўская вобл. – 2009), журналіста, літаратуразнаўца, пісьменніка, педагога, выдатніка адукацыі Рэспублікі Беларусь, выдатніка друку Рэспублікі Беларусь, заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь (1997), лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» дзеячам культуры і мастацтва ў намінацыі «Журналістыка» (2000)

1 **80** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСЕЯ СЦЯПАНАВІЧА СКАКУНА** (1946, в. Дастоева, Іванаўскі р-н), вучонага-эканаміста, дзяржаўнага і гаспадарчага дзеяча, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, заслужанага работніка сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь, кавалера ордэна Айчыны III ступені

4 **ДЗЕНЬ МІЛІЦЫІ**

4 **105** гадоў з дня нараджэння **ЭДУАРДА СТАНІСЛАВАВІЧА КУФКО** (1921, Расія – 1998), жывапісца, які працаваў у жанрах сюжэтна-тэматычнай карціны, партрэта

4 **20** гадоў з часу адкрыцця **СПОРТКОМПЛЕКСУ «ВІКТОРЫЯ»** ў г. Брэсце (цяпер — ДВСУ «БРЭСЦКІ АБЛАСНЫ ЦЭНТР АЛІМПІЙСКАГА РЭЗЕРВУ па ГУЛЬНЯВЫМ ВІДАМ СПОРТУ „ВІКТОРЫЯ“ імя А. П. МЯШКОВА»; 2006)

5 **130** гадоў з дня нараджэння **КАНДРАТА КРАПІВЫ** (сапр. КАНДРАТА КАНДРАТАВІЧА АТРАХОВІЧА; 1896, Уздзенскі р-н, Мінская вобл. – 1991), драматурга, байкапісца, празаіка, мовазнаўца, грамадскага дзеяча, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, народнага пісьменніка БССР (1956), заслужанага дзеяча навукі БССР (1978), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР (1941, 1951, 1971), Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1974), Героя Сацыялістычнай Працы (1975), кавалера ордэна Леніна (1940, 1948, 1966, 1975), удзельніка Першай сусветнай, Савецка-фінляндскай і Вялікай Айчыннай войнаў

5 **105** гадоў з дня нараджэння **МІХАІЛА ПАЎЛАВІЧА БЯРОЗКІ** (сапр. МІХАІЛА ПАЎЛАВІЧА ФРАЙМАНА; 1921, Ельскі р-н, Гомельская вобл. – 1992), сцэнарыста, драматурга, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР (1974)

7 *ці* **15** **245** гадоў з дня нараджэння **ЮЗАФА ЗАВАДСКАГА** (1781, Польшча – 1838), друкара, выдаўца, аднаго з заснавальнікаў выдавецкай справы

7 *ці* **8** **140** гадоў з дня нараджэння **УСЕВАЛАДА СЦЯПАНАВІЧА ФАЛЬСКАГА** (1886 ці 1887, г. Мінск – 1928[?]), грамадска-палітычнага, дзяржаўнага і культурнага дзеяча, акцёра, аднаго са стваральнікаў беларускага прафесійнага тэатра

8 **ДЗЕНЬ ЖАНЧЫН**

10 **80** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА ВАСІЛЬЕВІЧА ГАСЦЮХІНА** (1946, Расія), акцёра тэатра і кіно, народнага артыста Беларусі (1996), заслужанага артыста РСФСР (1982), заслужанага артыста БССР (1982), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР (1982), Дзяржаўнай прэміі СССР (1985), Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі (1993), кавалера ордэна Францыска Скарыны (2011)

11 **85** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ МІРОНАВІЧА ПЛЕСКАЦЭВІЧА** (1941, в. Мінічы, Ляхавіцкі р-н), кандыдата педагагічных навук, прафесара, вучонага ў галіне педагогікі, які ўнёс значны ўклад у навукова-педагагічную і грамадскую дзейнасць, заслужанага работніка адукацыі БССР (1991), выдатніка народнай асветы БССР (1986)

12 **90** гадоў з дня нараджэння **АЛЕГА РЫГОРАВІЧА МАРТЫНЕНКІ** (1936, Украіна – 2012), вучонага ў галіне цеплафізікі, доктара тэхнічных навук, прафесара, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, заслужанага дзеяча навукі Беларусі, лаўрэата прэміі акадэмій навук Украіны, Беларусі

і Малдовы (2000), Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі (2002), прэміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі імя акадэміка А. В. Лыкава (2005), прэміі Кітайскай Народнай Рэспублікі «Сяброўства» ў галіне навукі (2010)

12 **55** гадоў з дня стварэння **БАТАЛЬЁНА БЕЛАРУСКІХ АРЛЯНЯТ** (1971), грамадска-патрыятычнага руху па пошуку і ўвекавечанні памяці юных абаронцаў Радзімы ў гады Вялікай Айчыннай вайны

14 **95** гадоў з дня нараджэння **ПАЎЛА АНДРЭЕВІЧА МІСЬКО** (1931, Слуцкі р-н, Мінская вобл. – 2011), пісьменніка, перакладчыка, драматурга

14 **65** гадоў з часу заснавання **БРЭСЦКАЙ АБЛАСНОЙ ІНСПЕКЦЫІ па АХОВЕ ПРЫРОДЫ** (цяпер – БРЭСЦКІ АБЛАСНЫ КАМІТЭТ ПРЫРОДНЫХ РЭСУРСАЎ і АХОВЫ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ; 1961)

15 **ДЗЕНЬ КАНСТЫТУЦЫІ**

15 **ДЗЕНЬ СПАЖЫЎЦА**

15 **75** гадоў з часу прыняцця рашэння аб стварэнні **БРЭСЦКАЙ РАЁННАЙ САНІТАРНА-ЭПІДЭМІЯЛАГІЧНАЙ СТАНЦЫІ** (цяпер — ДУ «БРЭСЦКІ ЗАНАЛЬНЫ ЦЭНТР ГІГІЕНЫ і ЭПІДЭМІЯЛОГІІ»; 1951)

18 **ДЗЕНЬ УНУТРАНЫХ ВОЙСКАЎ**

18 **130** гадоў з дня нараджэння **АНТОНА КАНСТАНЦІНАВІЧА СУПІНСКАГА** (1896, в. Дастоева, Іванаўскі р-н – 1960), фальклярыста, збіральніка беларускага фальклору, этнографа, археолага

18 **105** гадоў з часу падпісання **РЫЖСКАГА МІРНАГА ДАГАВОРА** паміж РСФСР (таксама ад імя БССР) і УССР з аднаго боку і Польшчай з другога пра спыненне Савецка-польскай вайны 1919–1920 гг. і нармалізацыі адносін, па якім землі Заходняй Беларусі ўвайшлі ў склад Польшчы (Латвія; 1921)

19 **105** гадоў з дня нараджэння **ІОСІФА** (ЯЗЭПА) **АЛЯКСАНДРАВІЧА ЮХО** (1921, г. Мінск – 2004), вучонага-юрыста, гісторыка права, заснавальніка навуковай школы па вывучэнні гісторыі дзяржавы і права Беларусі, удзельніка падрыхтоўкі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г., аўтара шматлікіх навуковых прац, у т. л. манаграфій і навучальных дапаможнікаў

19 **95** гадоў з дня нараджэння **ГЕНАДЗЯ ВАСІЛЬЕВІЧА КІСЯЛЁВА** (1931, Расія – 2008), вучонага-гісторыка, літаратуразнаўца, пісьменніка, археографа, архівіста, які пакінуў вялікую навуковую і творчую спадчыну па пытаннях грамадскай думкі Беларусі XIX ст., гісторыі беларускай культуры, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1990)

19 **80** гадоў з дня нараджэння **ГЕНАДЗЯ ФЁДАРАВІЧА СУРМЫ** (1946, г. п. Глуск, Магілеўская вобл. – 2002), мастака, які працаваў у станковым жывапісе і акварэлі ў жанрах пейзажа і нацюрморта

20 **105** гадоў з дня нараджэння **БАСІ ЗАЛМАНАЎНЫ КАРПІЛАВАЙ** (дзяв. РАЗЕНБЛАНТ; 1921, Азербайджан – 2013), артысткі балета, заслужанай артысткі БССР (1961), кавалера ордэна Айчыннай вайны II ступені

20 **80** гадоў з дня нараджэння **КАНСТАНЦІНА ІВАНАВІЧА БАЛАНДЗІНА** (1946, в. Крошын, Баранавіцкі р-н – 2023), вучонага-гісторыка, культуролага, кандыдата гістарычных навук, даследчыка гісторыі Беларусі, беларускай культуры, заслужанага работніка адукацыі Рэспублікі Беларусь (2021), узнагароджанага медалём Францыска Скарыны (2011)

20 **70** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА БАРЫСАВІЧА ГАЛЬКЕВІЧА** (1956, г. Баранавічы), празаіка, урача, майстра спорту СССР (бокс)

20 **30** гадоў з часу падпісання Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб стварэнні **СВАБОДНАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ ЗОНЫ «БРЭСТ»** (СЭЗ «БРЭСТ»; 1996)

21 **105** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСЕЯ СЦЯПАНАВІЧА ПАПОВА** (1921, Расія – 1974), мастака дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (тэкстыль)

22 **ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ БЫТАВОГА АБСЛУГОЎВАННЯ НАСЕЛЬНІЦТВА і ЖЫЛЛЁВА-КАМУНАЛЬНАЙ ГАСПАДАРКІ** *(чацьвёртая нядзеля сакавіка)*

22 **240** гадоў з дня нараджэння **ІААХІМА ЛЯЛЕВЕЛЯ** (1786, Польшча – 1861), гісторыка, грамадскага і палітычнага дзеяча, даследчыка гісторыі і культуры Вялікага Княства Літоўскага, аднаго з заснавальнікаў і рэдактараў часопіса «Tygodnik Wilen’ski»

22 **35** гадоў з часу стварэння **НАЦЫЯНАЛЬНАГА АЛІМПІЙСКАГА КАМІТЭТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**, кіруючага органа алімпійскага руху ў Беларусі, прадстаўнічай арганізацыі Беларусі ў Міжнародным алімпійскім камітэце (г. Мінск; 1991)

23 **ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ ГІДРАМЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ**

24–25 **70** гадоў з часу правядзення ў г. Брэсце **НАРАДЫ МАЛАДЫХ ПАЭТАЎ і ПРАЗАІКАЎ** (1956)

26 **225** гадоў з дня нараджэння **КАНУТА ІВАНАВІЧА РУСЕЦКАГА** (1801, Літва – 1860), жывапісца, педагога, творчасць якога звязана з мастацкім жыццём Беларусі і Літвы, аўтара карцін на рэлігійныя тэмы

26 **90** гадоў з дня нараджэння **ВЯЧАСЛАВА ІВАНАВІЧА БАЦЮШКО** (1936, Пінскі р-н), педагога, кандыдата тэхнічных

навук, вучонага ў галіне будаўнічай вытворчасці, выдатніка ваеннага будаўніцтва, выдатніка вышэйшай школы СССР (1985)

27 **175** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСЕЯ ПАРФЁНАВІЧА САПУНОВА** (1851, Віцебская губ. – 1924), гісторыка, археографа, архівіста, краязнаўца, сапраўднага члена Рускага геаграфічнага таварыства, аўтара прац па гісторыі Віцебшчыны, члена-карэспандэнта Маскоўскага археалагічнага таварыства

28 **60** гадоў з дня нараджэння **ВІНЦЭСЯ** (ВЯЧАСЛАВА ВАСІЛЬЕВІЧА) **ВАШЭКІ** (1966, Івацэвіцкі р-н), паэта, празаіка

28 **30** гадоў з часу заснавання **ПАРАЛІМПІЙСКАГА КАМІТЭТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,** грамадскага аб’яднання, мэтай якога з’яўляецца далучэнне спартсменаў-інвалідаў да актыўнага грамадскага жыцця, садзейнічанне іх інтэграцыі ў сучаснае грамадства сродкамі фізічнай культуры і спорту (г. Мінск; 1996)

31 **105** гадоў з дня нараджэння **АНАТОЛЯ АБРАМАВІЧА РУДАКОВА** (1921, Расія – 1990), акцёра тэатра, заслужанага артыста БССР (1967)

КРАСАВІК

95 гадоў з пачатку дзейнасці першага беларускага **ТЭАТРА ЮНАГА ГЛЕДАЧА**, заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь (цяпер — Установа «БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ЮНАГА ГЛЕДАЧА»; г. Мінск; 1931)

80 гадоў з часу стварэння **БАРАНАВІЦКАГА ЗАВОДА СТАНКАПРЫЛАД,** адкрытага акцыянернага таварыства, спецыялізаванага прадпрыемства па выпуску тэхналагічнай аснасткі для металарэзных станкоў (г. Баранавічы; 1946)

1 **60** гадоў з часу адкрыцця **БРЭСЦКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭХНІЧНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА** (1966), вышэйшай навучальнай установы, буйнога навукова-вучэбнага цэнтра Беларусі, лаўрэата Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці (2021)

1 **125** гадоў з дня нараджэння **СЯРГЕЯ МІХАЙЛАВІЧА ПЯСЕЦКАГА** (1901 ці 1899, г. Ляхавічы – 1964), пісьменніка і публіцыста ў эміграцыі (Англія)

2 **ДЗЕНЬ ЯДНАННЯ НАРОДАЎ БЕЛАРУСІ і РАСІІ**

4 **130** гадоў з дня нараджэння **ПЛАТОНА АНДРЭЕВІЧА КРЭНЯ** (1896, Баранавіцкі р-н — 1962), паэта, мемуарыста, публіцыста, удзельніка Першай сусветнай і Грамадзянскай войнаў

4 **115** гадоў з дня нараджэння **СЯРГЕЯ ЯЎХІМАВІЧА БАГДАНЧУКА** (1911, Слонімскі р-н, Гродзенская вобл. – 1933), дзеяча рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, сакратара Брэсцкага акружнога камітэта КПЗБ

5 **ВЯЛІКДЗЕНЬ** *(па календары каталіцкай канфесіі)*

5 **ДЗЕНЬ ГЕОЛАГА** *(першая нядзеля красавіка)*

5 **105** гадоў з дня нараджэння **БАРЫСА УЛАДЗІМІРАВІЧА ЭРЫНА** (1921, Расія – 2008), тэатральнага рэжысёра, галоўнага рэжысёра Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы (1964–1968) і мастацкага кіраўніка Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа (1991–1993), заслужанага дзеяча мастацтваў УССР (1984), удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, кавалера ордэна Чырвонай Зоркі (1942)

5 **85** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА МАЙСЕЕВІЧА ЮДЗІЦКАГА** (1941, Украіна), пісьменніка, інжынера-электрамеханіка

5 **20** гадоў з часу стварэння **ПАЛЕСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА**, вышэйшай навучальнай установы, створанай у выніку рэарганізацыі Пінскага дзяржаўнага вышэйшага банкаўскага каледжа Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, лаўрэата Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці (2018, 2021) (г. Пінск; 2006)

6 **90** гадоў з дня нараджэння **ФЁДАРА ПЯТРОВІЧА СЯНЬКО** (1936, в. Казлякевічы, Баранавіцкі р-н – 2020), работніка сельскай гаспадаркі, дзяржаўнага дзеяча Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР (1971), Героя Сацыялістычнай Працы (1971), кавалера ордэна Леніна, ордэнаў Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэна «Знак Пашаны»

6 **80** гадоў з дня нараджэння **ВАЛЯНЦІНЫ МІХАЙЛАЎНЫ КОЎТУН** (па мужу НОВІК; 1946, Рэчыцкі р-н, Гомельская вобл. – 2011), пісьменніцы, крытыка, даследчыка пытанняў фальклору ў сучаснай беларускай паэзіі, праблем перакладаў з рускай і ўкраінскай моў, лаўрэата Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова (1986)

6 **70** гадоў з дня нараджэння **НАТАЛЛІ ПЯТРОЎНЫ ГАЛІМАВАЙ** (1956, г. Брэст), вучонага-гісторыка, аўтара прац па гістарычным краязнаўстве, сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі ў пасляваенны перыяд

7 **100** гадоў з часу стварэння **БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ДРУЖБЫ і КУЛЬТУРНАЙ СУВЯЗІ з ЗАМЕЖНЫМІ КРАІНАМІ**, грамадскага аб’яднання, мэтай якога была папулярызацыя духоўных і культурных здабыткаў беларускага народа, мацаванне мастоў добрасуседства і сяброўства з іншымі народамі свету (Мінск; 1926)

8 **35** гадоў з часу заснавання газеты **«РЭСПУБЛІКА»**, штодзённай грамадска-палітычнай газеты (г. Мінск; 1991)

9 **105** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСЕЯ АНДРЭЕВІЧА ЦАРОВА** (1921, Расія – 1978), беларускага і расійскага акцёра, заслужанага

артыста БССР (1968)

9 **80** гадоў з часу прыняцця рашэння аб адкрыцці **ДЗІЦЯЧАЙ ПАЛІКЛІНІКІ** ў г. Брэсце на пл. Свабоды, 3 (цяпер у будынку — ДУП «ЛЯЧЭБНА-КАНСУЛЬТАТЫЎНАЯ ПАЛІКЛІНІКА»; 1946)

10 **95** гадоў з дня нараджэння **ІВАНА ПЯТРОВІЧА ЧЫГРЫНА** (1931, Слонімскі р-н, Гродзенская вобл. – 2006), літаратуразнаўца, крытыка, паэта

10 **60** гадоў з дня нараджэння **МІКОЛЫ ІЛЬЮЧЫКА** (1966, в. Багданаўка, Лунінецкі р-н – 2025), паэта, краязнаўца, святара

11 **30** гадоў з часу стварэння **ЗАКАЗНІКА ЗВАНЕЦ**, ландшафтнага заказніка рэспубліканскага значэння (Драгічынскі і Кобрынскі р-ны; 1996)

12 **ВЯЛІКДЗЕНЬ** *(па календары праваслаўнай канфесіі)*

12 **ДЗЕНЬ ВОЙСКАЎ ПРОЦІПАВЕТРАНАЙ АБАРОНЫ** *(другая нядзеля красавіка)*

12 **485** гадоў з дня нараджэння **ІПАЦІЯ ПАЦЕЯ** (свец. АДАМА ЛЬВОВІЧА; 1541, Камянецкі пав. – 1613), царкоўнага і дзяржаўнага дзеяча Вялікага Княства Літоўскага, пісьменніка-палеміста, філосафа, багаслова, аднаго з ініцыятараў і арганізатараў Брэсцкай уніі 1596 г.

14 **РАДАЎНІЦА** *(па календары каталіцкай канфесіі)*

14 **75** гадоў з дня нараджэння **ВІКТАРА ДЗМІТРЫЕВІЧА НІКІЦІНА** (1951, г. Брэст), заслужанага архітэктара Рэспублікі Беларусь (2009), сярод асноўных работ якога — праекты галоўнага корпуса Беларускага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, падземнага гандлёвага цэнтра «Сталіца», гасцініцы «Еўропа»

16 **35** гадоў з часу стварэння штомесячнага навукова-метадычнага ілюстраванага часопіса **«ПРАЛЕСКА»** («ДАШКОЛЬНАЯ АДУКАЦЫЯ») для педагогаў дашкольных устаноў (г. Мінск; 1991)

17 **90** гадоў з дня нараджэння **МІХАСЯ** (МІХАІЛА МІХАЙЛАВІЧА) **РУДКОЎСКАГА** (1936, Ганцавіцкі р-н – 1991), паэта, які працаваў у жанры балады, элегіі, санета, трыялета, перакладчыка

17 **45** гадоў з часу адкрыцця **ПЕРШАГА ТРАЛЕЙБУСНАГА МАРШРУТА** ў г. Брэсце (1981)

18 **45** гадоў з часу адкрыцця **ПАЛАЦА КУЛЬТУРЫ БРЭСЦКАГА АБЛАСНОГА САВЕТА ПРАФСАЮЗАЎ** у г. Брэсце (1981)

19 **145** гадоў з дня нараджэння **УСЕВАЛАДА МАКАРАВІЧА ІГНАТОЎСКАГА** (1881, в. Такары, Камянецкі р-н – 1931), вучонага-гісторыка, акадэміка Акадэміі навук Беларусі і Акадэміі навук Украіны, першага прэзідэнта Акадэміі навук Беларусі (1928–1931), грамадска-палітычнага дзеяча

20 **145** гадоў з дня нараджэння **ВАЛЯНЦІНА ВІКТАРАВІЧА**

ВОЛКАВА (1881, Расія – 1964), жывапісца, педагога, народнага мастака БССР (1955), аўтара выяў герба БССР узораў 1927 і 1938 гг.

21 **РАДАЎНІЦА** *(па календары праваслаўнай канфесіі)*

21 **105** гадоў з пачатку выдання газеты **«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА»** («КРАСНАЯ СМЕНА»), маладзёжнай газеты, органа Беларускага саюза моладзі (г. Мінск; 1921)

22 **ДЗЕНЬ СУДОВАГА ЭКСПЕРТА**

22 **65** гадоў з дня нараджэння **АЛЕНЫ БАРЫСАЎНЫ СПІРЫДОВІЧ** (1961, г. Мінск), журналіста, дыктара беларускага тэлебачання, вядучай тэлепраграм і канцэртаў, заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь (1999), кавалера ордэна Францыска Скарыны (2016)

23 **140** гадоў з дня нараджэння **ЗМІТРАКА БЯДУЛІ** (сапр. САМУІЛА ЯФІМАВІЧА ПЛАЎНІКА; 1886, Лагойскі р-н, Мінскай вобл. – 1941), пісьменніка, празаіка, паэта, перакладчыка, даследчыка пытанняў этнаграфіі і фальклору

24 **90** гадоў з дня нараджэння **ВЕРЫ РЫЧ** (1936, Вялікабрытанія – 2009), паэтэсы, журналіста, перакладчыка, аўтара перакладаў літаратурных твораў беларускіх аўтараў, артыкулаў пра беларускую літаратуру, папулярызатара ўкраінскай і беларускай культуры за мяжой

26 **ДЗЕНЬ ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ ТРАГЕДЫІ**

26 **40** гадоў з часу здарэння **ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ КАТАСТРОФЫ 1986 г.**, адной з найбуйнейшых у свеце тэхнагенных аварый XX ст. (Украіна; 1986)

27 **85** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ ЗАХАРАВІЧА КЕРНОГІ** (1941, г. Баранавічы – 2009), журналіста, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР (1974)

28 **125** гадоў з часу **ПАЖАРУ ў г. БРЭСЦЕ** (1901), які зруйнаваў палову горада

29 **105** гадоў з дня нараджэння **МІКОЛЫ** (МІКАЛАЯ ІВАНАВІЧА) **ЕРМАЛОВІЧА** (1921, Дзяржынскі р-н, Мінская вобл. – 2000), вучонага-гісторыка, літаратуразнаўца, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (1992)

30 **145** гадоў з дня нараджэння **ЯНКІ ЖУРБЫ** (сапр. ІВАНА ЯКАЎЛЕВІЧА ІВАШЫНА; 1881, г. Чашнікі, Віцебская вобл. – 1964), пісьменніка, паэта, перакладчыка, настаўніка рускай і беларускай мовы

30 **125** гадоў з дня нараджэння **САЙМАНА СМІТА КУЗНЯЦА** (сапр. СЯМЁНА АБРАМАВІЧА КУЗНЯЦА; 1901, г. Пінск – 1985), вучонага-эканаміста і статыстыка, аднаго з заснавальнікаў эмпірычнай эканомікі і колькаснай эканамічнай гісторыі, члена Нацыянальнай акадэміі навук ЗША, лаўрэата Нобелеўскай прэміі

(1971)

30 **75** гадоў з дня нараджэння **НАТАЛЛІ УЛАДЗІМІРАЎНЫ СУСТАВАЙ** (1951, Германія), мастака, кніжнага графіка, аўтара ілюстрацый да многіх дзіцячых кніг, педагога

МАЙ

55 гадоў з часу адкрыцця **МЕМАРЫЯЛЬНАГА КОМПЛЕКСУ ПАРТЫЗАНСКАЙ СЛАВЫ «ХАВАНШЧЫНА»**, філіяла ДУК «Івацэвіцкі гісторыка-краязнаўчы музей» (Івацэвіцкі р-н; 1971)

30 гадоў з пачатку выдання часопіса Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь **«АРМИЯ»** (г. Мінск; 1996)

1 **СВЯТА ПРАЦЫ**

1 **130** гадоў з дня нараджэння **АДАМА АНТОНАВІЧА САКОЛЬЧЫКА** (1896, Мінскі р-н – 1983), бібліёграфа, бібліятэкара, педагога, удзельніка Першай сусветнай, Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў

1 **95** гадоў з дня нараджэння **АЛЕГА АНТОНАВІЧА ЛОЙКІ** (1931, г. Слонім, Гродзенскай вобл. – 2008), пісьменніка, літаратуразнаўца, крытыка, прафесара, доктара філалагічных навук (1969), члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1990)

3 **255** гадоў з дня нараджэння **АЎГУСТА ЛЮДВІГАВІЧА БЕКЮ** (1771, г. Гродна – 1824), беларускага ўрача, прафесара, педагога, доктара і прафесара медыцыны, доктара філасофіі і медыцыны, які адным з першых у Беларусі і Літве пачаў вакцынацыю супраць воспы

3 **240** гадоў з дня нараджэння **КАНСТАНЦІНА ІГНАТАВІЧА ТЫЗЕНГАЎЗА** (1786, Шчучынскі р-н, Гродзенская вобл. – 1853), даследчыка фаўны Беларусі, заснавальніка беларускай арніталогіі, стваральніка першага ў Беларусі арніталагічнага музея ў Паставах

3 **235** гадоў з дня нараджэння **ГЕНРЫКА ЖАВУСКАГА** (РЖАВУСКІ, РАВУСКІ; 1791, Украіна – 1866), польскага пісьменніка, публіцыста, аўтара гістарычных твораў, прысвечаных Вялікаму Княству Літоўскаму

4 **115** гадоў з дня нараджэння **ПЯТРА** (ПЯТРА МІКАЛАЕВІЧА) **РУНЦА** (1911, Пухавіцкі р-н, Мінская вобл. – 1997), пісьменніка, які склаў кнігу дзіцячых успамінаў пра вайну «Ніколі не забудзем» (разам з Я. Маўрам)

5 **ДЗЕНЬ ДРУКУ**

6 **105** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА ТРАФІМАВІЧА СІМУРАВА** (1921, Гарадоцкі р-н, Віцебская вобл. – 2007),

журналіста, пісьменніка, заслужанага работніка культуры БССР (1974), удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР (1978)

7 **ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ РАДЫЁ, ТЭЛЕБАЧАННЯ і СУВЯЗІ**

7–13 **105** гадоў з часу правядзення **ПЕРШАГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА З'ЕЗДУ ПРАФЕСІЙНЫХ САЮЗАЎ** (1921)

8 **145** гадоў з дня нараджэння **ЕПІСКАПА ІААНА РЫЛЬСКАГА** (свец. ІВАНА ДЗМІТРЫЕВІЧА ПАШЫНА; 1881, Мазырскі пав. – 1938), рэлігійнага дзеяча, свяшчэннамучаніка, епіскапа

8 **75** гадоў з дня нараджэння **ЛЕАНІДА МІХАЙЛАВІЧА РАЦЬКО** (1951, Мінская вобл.), мастака дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (мастацкая апрацоўка металу), дызайнера, жывапісца

8 **65** гадоў з дня нараджэння **АНДРЭЯ ЮР'ЕВІЧА БОДАКА** (1961, г. Брэст), вучонага-гісторыка, які займаецца даследаваннем нацыянальнай палітыкі ў краінах Усходняй Еўропы, кандыдата гістарычных навук, дацэнта

9 **ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ**

9 **160** гадоў з дня нараджэння **ЛЬВА САМОЙЛАВІЧА БАКСТА** (сапр. РОЗЕНБЕРГА; 1866, г. Гродна – 1924), тэатральнага мастака, графіка, кніжнага ілюстратара, жывапісца, адным з вучняў якога з'яўляўся Марк Шагал

10 **ДЗЕНЬ ДЗЯРЖАЎНАГА СЦЯГА, ДЗЯРЖАЎНАГА ГЕРБА і ДЗЯРЖАЎНАГА ГІМНА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ** *(другая нядзеля мая)*

10 **95** гадоў з дня нараджэння **СЦЯПАНА ЗАХАРАВІЧА ГАЎРУСЁВА** (1931, Дубровенскі р-н, Віцебская вобл. – 1988), паэта, крытыка, перакладчыка, лаўрэата Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова (1987)

10 **90** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА АДАМАВІЧА КРАЎЧУКА** (1936, г. Брэст – 2014), мастака тэатра, педагога

10 **60** гадоў з часу заснавання вопытнай гаспадаркі **«ПУШЧАНСКАЕ»** на тэрыторыі запаведніка «Белавежская пушча» (1966)

11 **75** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ КАНСТАНЦІНАВІЧА ЛІТВІНА** (1951, в. Пятрэвічы, Баранавіцкі р-н), кампазітара, дацэнта, аўтара твораў вакальнай і інструментальнай музыкі

14 **360** гадоў з дня нараджэння **КАЗІМІРА АЛЯКСАНДРА ПАЦЕЯ** (1666–1728), дзяржаўнага і ваеннага дзеяча Вялікага Княства Літоўскага

15 **ДЗЕНЬ СЯМ'І**

15 **90** гадоў з дня нараджэння **БАРЫСА ІВАНАВІЧА САЧАНКІ** (1936, Хойніцкі р-н, Гомельская вобл. – 1995), пісьменніка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1982), Літаратурнай прэміі імя І. Мележа (1991), кавалера двух ордэнаў

«Знак Пашаны», уладальніка медаля Францыска Скарыны

16 **ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ і СПОРТУ** *(трэцяя субота мая)*

16 **115** гадоў з дня нараджэння **ВАСІЛЯ ВІТКІ** (сапр. ЦІМОХА ВАСІЛЬЕВІЧА КРЫСЬКО; 1911, Слуцкі р-н, Мінская вобл. – 1996), паэта, пісьменніка, крытыка, драматурга, педагога, заслужанага дзеяча культуры БССР (1970), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1972)

17 **140** гадоў з дня нараджэння **СТАФАНА СТАФАНАВІЧА МАРКОЎСКАГА** (1886–1949), музыканта, педагога, заснавальніка беларускай школы ігры на ўдарных інструментах

17 **80** гадоў з дня нараджэння **ВАСІЛЯ УЛАДЗІМІРАВІЧА ГАДУЛЬКІ** (1946, в. Федзькавічы, Жабінкаўскі р-н – 1993), паэта, педагога

18 **120** гадоў з часу рэгістрацыі першага легальнага беларускага выдавецкага таварыства **«ЗАГЛЯНЕ СОНЦА і ў НАША АКОНЦА»** («ЗАГЛЯНЕ СОНЦЭ и ў НАШЭ ВАКОНЦЭ») (г. Санкт-Пецярбург, Расія; 1906–1914)

18 **80** гадоў з дня нараджэння **ІГАРА ВІКТАРАВІЧА ВОЎЧАКА** (1946), рэжысёра-мультыплікатара, сцэнарыста, кампазітара, піяніста, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь (2011)

20 **90** гадоў з дня нараджэння **ПЯТРА ПЯТРОВІЧА СУЦЬКО** (1936, в. Асошнікі, Пружанскі р-н – 2010), журналіста, заслужанага работніка культуры БССР (1982), заслужанага журналіста Беларускага саюза журналістаў

22 **75** гадоў з дня нараджэння **АНАСТАСІІ ІВАНАЎНЫ ФЯЦІСАВАЙ** (1951, г. Брэст), жывапісца, мастака афармленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (эмаль)

23 **105** гадоў з часу заснавання **ФУНДАМЕНТАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БДУ**, адной са старэйшых і буйных універсітэцкіх бібліятэк Беларусі (г. Мінск; 1921)

23 **30** гадоў з часу здзяйснення трагічнага **ПОДЗВІГУ ЛЁТЧЫКАМ-ЗНІШЧАЛЬНІКАМ УЛАДЗІМІРАМ МІКАЛАЕВІЧАМ КАРВАТАМ**, калі ён адвёў палаючы самалёт Су-27 ад населенага пункта (Баранавіцкі р-н; 1996)

24 **90** гадоў з дня нараджэння **КАНСТАНЦІНА ВАСІЛЬЕВІЧА ДРОНЯ** (1936, в. Ківачына, Пружанскі р-н – 2015), паэта, педагога-гісторыка

27 **155** гадоў з дня нараджэння **ІСАКА АБРАМАВІЧА СЕРБАВА** (1871, Слаўгарадскі р-н, Магілёўская вобл. – 1943), этнографа, фальклярыста, археолага, які першы з беларускіх этнографаў стварыў фотатэку, кандыдата гістарычных навук (1934)

27 **95** гадоў з дня нараджэння **ВАСІЛЯ ПРАКОПАВІЧА**

ЖУРАЎЛЁВА (1931, Мсціслаўскі р-н, Магілёўская вобл.), крытыка і літаратуразнаўца, доктара філалагічных навук, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (2002)

27 **75** гадоў з дня нараджэння **НАТАЛЛІ АЛЯКСАНДРАЎНЫ РУДНЕВАЙ** (1951, Расія), артысткі оперы, педагога, заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь (1994), лаўрэата тэатральнай прэміі імя Л. Александроўскай (1997), прэміі Беларускага саюза тэатральных дзеячоў «Крыштальная Паўлінка» (2012)

28 **ДЗЕНЬ ПАГРАНІЧНІКА**

28 **190** гадоў з дня нараджэння ЯНА АЛЯКСАНДРА (ІВАНА АЛЯКСАНДРАВІЧА) **КАРЛОВІЧА** (1836, Літва – 1903), лінгвіста, этнографа, фальклярыста, музыказнаўца, збіральніка мелодый беларускіх народных песень, аўтара этнаграфічных даследаванняў, зборніка беларускіх і літоўскіх казак, гісторыка-літаратурных і публіцыстычных артыкулаў

28 **105** гадоў з дня нараджэння **НУТЫ АЎРУМ-ЭЛЬЕВІЧА ШПІГЕЛЬМАНА** (1921, Украіна – 1974), заслужанага архітэктара БССР (1974), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР (1968)

28 **80** гадоў з дня нараджэння **МІХАІЛА ІВАНАВІЧА ДЗЯМЧУКА** (1946, в. Дзевяткі, Кобрынскі р-н – 2016), фізіка, вучонага ў галіне прыбора- і машынабудавання, дзяржаўнага дзеяча, доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі Беларусі, заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь (1996), лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола БССР (1974), Дзяржаўнай прэміі БССР (1986)

28 **70** гадоў з дня нараджэння **МАРЫІ ПЯТРОЎНЫ МАРШАК** (1956, в. Любань, Лунінецкі р-н), спявачкі, салісткі Беларускага дзяржаўнага ансамбля народнай музыкі «Свята», заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь (2000)

28 **55** гадоў з дня нараджэння **СВЯТЛАНЫ АНУФРЫЕЎНЫ ЛОКТЫШ** (КУРЫЛІК; 1971, в. Люсіна, Ганцавіцкі р-н), паэтэсы, публіцыста, журналіста

29 **80** гадоў з часу стварэння **МІНСКАГА ТРАКТАРНАГА ЗАВОДА** (1946), адкрытага акцыянернага таварыства па вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі, кіруючай кампаніі холдынга «МТЗ-Холдынг», лаўрэата Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці (2000, 2022) і прэміі Садружнасці Незалежных Дзяржаў за дасягненні ў галіне якасці прадукцыі і паслуг (2023)

30 **130** гадоў з дня нараджэння **КАНСТАНЦІНА МІКАЛАЕВІЧА САННІКАВА** (1896, г. Рагачоў, Гомельская вобл. – 1965), рэжысёра, акцёра, педагога, прафесара, аднаго з заснавальнікаў Беларускага драматычнага тэатра, народнага артыста БССР (1949), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР (1948, 1952)

30 **75** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА СТАНІСЛАВАВІЧА ПАДАБЕДА** (1951, г. Мінск), акцёра тэатра і кіно, заслужанага артыста БССР (1989), народнага артыста Рэспублікі Беларусь (2020)

30 **75** гадоў з дня нараджэння **АНАТОЛЯ МІХАЙЛАВІЧА ХВІСЕВІЧА** (1951, в. Стаховічы, Пінскі р-н – 2020), мастака манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, афарміцеля, жывапісца

31 **ДЗЕНЬ ХІМІКА** *(апошняя нядзеля мая)*

31 **280** гадоў з дня нараджэння **АНТОНА ЛОЙКІ** (1746, г. Слуцк, Мінская вобл. – ?), танцоўшчыка, балетмайстра, саліста прыдворнага тэатра Радзівілаў у Нясвіжы, аўтара шэрага пастановак балетаў

31 **50** гадоў з дня нараджэння **АНАТОЛЯ ВАСІЛЬЕВІЧА МАШЧУКА** (1976, г. Брэст), вучонага-гісторыка, аўтара прац па гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг.

ЧЭРВЕНЬ

1 **190** гадоў з часу закладкі першага каменя **БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ** (1836), комплексу абарончых збудаванняў XIX – пачатку XX ст.

1 **115** гадоў з дня нараджэння **ЯКУБА ГЕРАСІМАВІЧА МІСКО** (1911, Слонімскі р-н, Гродзенская вобл. – 1981), пісьменніка, журналіста, перакладчыка, заслужанага дзеяча культуры БССР (1967)

1 **80** гадоў з дня нараджэння **ГЕНРЫХА ВАЦЛАВАВІЧА ДАЛІДОВІЧА** (1946, Стаўбцоўскі р-н, Мінская вобл.), пісьменніка, лаўрэата Літаратурнай прэміі імя І. Мележа (1987), Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь імя Якуба Коласа (1996)

3 **130** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА ІГНАТАВІЧА КІТАЕЎСКАГА** (1896, в. Стаўпы, Жабінкаўскі р-н – 1940), паэта, аўтара вершаў на рускай і ўкраінскай (палескай) мовах

4 **80** гадоў з дня нараджэння **ЛЮДМІЛЫ ГЕНРЫХАЎНЫ БРЖАЗОЎСКАЙ** (1946, г. Мінск – 2023), артысткі балета, педагога, народнай артысткі БССР (1975)

4 **80** гадоў з дня нараджэння **ВІКТАРА ВАСІЛЬЕВІЧА ШАВЯЛЕВІЧА** (1946, Узбекістан – 2004), рэжысёра кіно і тэлебачання, сцэнарыста, лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (1998)

5 **ДЗЕНЬ АХОВЫ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ**

6 **185** гадоў з дня нараджэння **ЭЛІЗЫ АЖЭШКА** (дзяв. ПАЎЛОЎСКАЙ; 1841, маёнт. Мількаўшчына, Гродзенскі пав. – 1910), пісьменніцы, аўтара мастацкіх твораў, публіцыстычных і літаратурна-крытычных прац, перакладзеных на многія

еўрапейскія мовы

6 **75** гадоў з дня нараджэння **КАНСТАНЦІНА МІХАЙЛАВІЧА БАНДАРЭНКІ** (1951, Кармянскі р-н, Гомельская вобл.), вучонага-гісторыка, доктара гістарычных навук, дацэнта, аўтара прац па гісторыі палітычных партый Расіі і Беларусі пачатку XX ст., заслужанага работніка адукацыі Рэспублікі Беларусь, выдатніка адукацыі Беларусі

6 **65** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА ІВАНАВІЧА ГАНЧАРУКА** (1961, Расія), жывапісца, педагога, лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва (2014)

7 **ДЗЕНЬ МЕЛІЯРАТАРА** *(першая нядзеля чэрвеня)*

8 **130** гадоў з дня нараджэння **МІХАІЛА МАЦВЕЕВІЧА ФІЛІПОВІЧА** (1896, г. Мінск – 1947), жывапісца, графіка, мастака дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, які адным з першых айчынных мастакоў звярнуўся да нацыянальнай тэматыкі, удзельніка Грамадзянскай вайны

8 **105** гадоў з дня нараджэння **МІХАІЛА СЦЯПАНАВІЧА КАМЕЛЬЧЫКА** (1921, Талачынскі р-н, Віцебская вобл. – 2006), гвардыі палкоўніка, удзельніка вызвалення г. Пінска ў Вялікую Айчынную вайну, Героя Савецкага Саюза (1946), заслужанага работніка культуры РСФСР (1983), кавалера ордэна Чырвонага Сцяга (двойчы), ордэна Айчыннай вайны I ступені (двойчы), ордэна Чырвонай Зоркі

8 **80** гадоў з дня нараджэння **ВАЛЕРЫЯ АЛЯКСАНДРАВІЧА ЛОЙКІ** (1946, в. Саўцавічы, Баранавіцкі р-н), вучонага-фізіка ў галіне фізічнай оптыкі, даследчыка оптыкі сонечных элементаў, вадкіх крышталёў, доктара фізіка-матэматычных навук

11 **130** гадоў з дня нараджэння **ЯЎГЕНІЯ РЫГОРАВІЧА ПЕКАРСКАГА** (1911, в. Турна, Камянецкі р-н – 1942), удзельніка рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі і барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны

11 **80** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА БАРЫСАВІЧА КАШПЕРАВА** (1946, г. Мінск), акцёра тэатра і кіно, заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь (2014), лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва (2012), уладальніка прыза Беларускага саюза тэатральных дзеячаў «Крыштальная зорка» (2005), уладальніка медаля Францыска Скарыны (2006)

12 **95** гадоў з часу пераўтварэння мястэчка **ЛЯХАВІЧЫ** (1931) Баранавіцкага павета Навагрудскага ваяводства ў горад

12 **85** гадоў з дня нараджэння **ДОТА САМАТАВІЧА АБДУСАМАТАВА** (1941, Таджыкістан), мастака ў галіне мэблёва-дэкаратыўных тканін, у станковым жывапісе і габелене

13 **70** гадоў з дня нараджэння **ЛЕАНІДА АРКАДЗЬЕВІЧА ТАРАНЕНКІ** (1956, г. Маларыта), спартсмена (цяжкая атлетыка), заслужанага майстра спорту СССР, чэмпіёна XXII Алімпійскіх гульняў (1980), чэмпіёна свету (1980, 1991) і Еўропы (1980, 1988, 1991, 1992, 1996), кавалера ордэна Дружбы народаў

14 **ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ ЛЁГКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ** *(другая нядзеля чэрвеня)*

14 **105** гадоў з дня нараджэння **ІСААКА ЯФІМАВІЧА МАСЛАНА** (1921, г. Мінск – 1996), мастака-афарміцеля, графіка, заслужанага работніка культуры БССР (1981)

14 **95** гадоў з дня нараджэння **ІГАРА ДЗМІТРЫЕВІЧА САРОКІНА** (1931, Расія – 2009), спевака (драматычны барытон), народнага артыста БССР (1963), заслужанага артыста РСФСР (1961)

15 **205** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ ІВАНАВІЧА ЗАРЭМБЫ** (1821, Віцебская губ. – 1879), музычнага тэарэтыка, педагога, кампазітара, прафесара

15 **125** гадоў з дня нараджэння **ІВАНА ПРАКОПАВІЧА СІВАКОВА** (1901, Расія – 1944), военачальніка, генерал-маёра, удзельніка вызвалення Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Героя Савецкага Саюза (1944)

15 *ці* **28** **115** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА РЫГОРАВІЧА КАЛЕСНІКА** (1911, Украіна – 1943), лейтэнанта, удзельніка вызвалення Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Героя Савецкага Саюза (1944)

15 **90** гадоў з дня нараджэння **МІКОЛЫ ГІЛЯ** (сапр. МІКАЛАЯ СЫМОНАВІЧА ГІЛЕВІЧА; 1936, Лагойскі р-н, Мінская вобл. – 2022), пісьменніка, перакладчыка, журналіста, публіцыста

15 **85** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА ТРАФІМАВІЧА КАБУША** (1941, г. Дуброўна, Віцебская вобл.), доктара педагагічных навук, вучонага ў галіне педагогікі, аўтара навукова-метадычных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола БССР (1988), выдатніка народнай асветы БССР (1972)

15 **75** гадоў з дня нараджэння **ЛЮДМІЛЫ ІВАНАЎНЫ РАБУШКА** (1951, г. Мінск), артысткі балета, тэатразнаўца, заслужанай артысткі БССР (1982)

16 **115** гадоў з дня нараджэння **ДЗМІТРЫЯ АЛЯКСАНДРАВІЧА ЛУКАСА** (1911, Віленская губ. – 1979), кампазітара, педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР (1955), кавалера ордэна «Знак Пашаны»

17 **100** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ МІКАЛАЕВІЧА ЯРОМЕНКІ** (старэйшага; 1926, Расія – 2000), акцёра тэатра і кіно, народнага артыста БССР (1967), народнага артыста СССР (1989), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР (1988)

17 **85** гадоў з дня нараджэння **ФРАНІ МІХАЙЛАЎНЫ ЛІТВІНКІ** (1941, г. Барысаў, Мінская вобл.), мовазнаўца, педагога, прафесара, спецыяліста ў галіне рускага мовазнаўства, доктара педагагічных навук, кандыдата філалагічных навук, выдатніка народнай адукацыі БССР (1991)

17 **85** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ ВАСІЛЬЕВІЧА СІРАТЫ** (1941, Украіна), баяніста, дырыжора, кампазітара, аранжыроўшчыка, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР (1986)

17 **80** гадоў з дня нараджэння **ВАЛЯНЦІНА МІХАЙЛАВІЧА ГАПІЕНКІ** (1946, Расія), архітэктара, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР (1988), сярод асноўных работ якога — генеральны план развіцця Брэста, Брэсцкі аэравакзал, Лядовы палац, універсальны спартыўны комплекс «Вікторыя» і інш.

17 **65** гадоў з дня нараджэння **СЯМЁНА БАРЫСАВІЧА ШАПІРЫ** (1961, Любанскі р-н, Мінская вобл.), дзяржаўнага дзеяча, эканаміста, доктара эканамічных навук, прафесара, заслужанага работніка сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь (2016)

18 **185** гадоў з дня нараджэння **ЯГОРА ЯГОРАВІЧА ЗАМЫСЛОЎСКАГА** (1841, г. Гродна – 1896), педагога, расійскага гісторыка, археографа, члена-карэспандэнта Пецярбургскай акадэміі навук

20 **115** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА КАНСТАНЦІНАВІЧА ШЫДЛОЎСКАГА** (1911, Смаргонскі р-н, Гродзенская вобл. – 2002), кампазітара, педагога, дзеяча самадзейнага мастацтва, аўтара вядомых песень, стваральніка песенных калектываў, заслужанага дзеяча культуры БССР (1960)

21 **ДЗЕНЬ МЕДЫЦЫНСКІХ РАБОТНІКАЎ** *(трэцяя нядзеля чэрвеня)*

21 **285** гадоў з дня нараджэння **ЖАНА ЭМАНУЭЛЯ ЖЫЛІБЕРА** (1741, Францыя – 1814), французскага і беларускага натураліста, хірурга і анатама, заснавальніка першай у Беларусі медыцынскай акадэміі ў Гродне, акушэрскай і ветэрынарнай школ, батанічнага саду

21 **80** гадоў з дня нараджэння **ЯКАВА МІХАЙЛАВІЧА ЛАБОВІЧА** (1946, г. Гомель – 2020), дзеяча цыркавога мастацтва, заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь (1998), кавалера ордэна Францыска Скарыны (2013)

22 **ДЗЕНЬ УСЕНАРОДНАЙ ПАМЯЦІ АХВЯР ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ і ГЕНАЦЫДУ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА**

22 **105** гадоў з пачатку выдання **«БЕЛОРУССКОЙ ВОЕННОЙ ГАЗЕТЫ. ВО СЛАВУ РОДИНЫ»**, цэнтральнага друкаванага органа Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь (г. Смаленск, г. Мінск; 1921)

22 **95** гадоў з дня нараджэння **МІКОЛЫ** (МІКАЛАЯ ІГНАТАВІЧА) **ЯНЧАНКІ** (1931, Магілёўскі р-н – 2000), пісьменніка, перакладчыка

22 **85** гадоў з пачатку **ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ**, вызваленчай вайны народаў СССР супраць фашысцкай Германіі і яе саюзнікаў, найважнейшай састаўной часткі Другой сусветнай вайны (1941–1945)

22 **85** гадоў з пачатку **ГЕРАІЧНАЙ АБАРОНЫ БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ** (да канца ліпеня 1941 г.) савецкімі войскамі

22 **85** гадоў з часу здзяйснення над Брэстам **ПАВЕТРАНАГА ТАРАНА ВАЕННЫМ ЛЁТЧЫКАМ ПЯТРОМ СЯРГЕЕВІЧАМ РАБЦАВЫМ** (1941)

22 **75** гадоў з дня нараджэння **ВАЛЯНЦІНЫ ВАСІЛЬЕЎНЫ СЯРЫХ** (1951, г. Бабруйск, Магілёўская вобл.), кампазітара, аўтара апрацовак народных песень для хору, музычных перадач на радыё

23 **90** гадоў з дня нараджэння **ВАЛЯНЦІНА ПЯТРОВІЧА ЯРАШЭВІЧА** (1936, в. Толкава, Драгічынскі р-н – 2000), вучонага ў галіне чыгуначнага транспарту, заслужанага работніка народнай адукацыі Рэспублікі Беларусь (1994), кавалера ордэна Дружбы народаў

23 **85** гадоў з часу адбыцця ў Камянецкім раёне **БОЮ 30-Й ТАНКАВАЙ ДЫВІЗІІ ПАЛКОЎНІКА СЯМЁНА ІЛЬІЧА БАГДАНАВА** (1941) з гітлераўскімі войскамі, у выніку якога дзве танкавыя дывізіі праціўніка былі адкінуты на некалькі кіламетраў

23 **65** гадоў з дня нараджэння **ВАЛЕРЫЯ АНАТОЛЬЕВІЧА КУХАРЧУКА** (1961, Казахстан), паэта, журналіста

26 **ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ ПРАКУРАТУРЫ**

26 **85** гадоў з часу стварэння ў г. Пінску **ПЕРШАГА НА БЕЛАРУСІ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА** (1941) пад кіраўніцтвам Васілія Захаравіча Каржа для барацьбы з нямецка-фашысцкімі акупантамі

26 **85** гадоў з часу заснавання ААТ **«558 АВІЯЦЫЙНЫ РАМОНТНЫ ЗАВОД»**, вядучага прадпрыемства абароннага сектара эканомікі Рэспублікі Беларусь, якое ажыццяўляе рамонт і мадэрнізацыю авіяцыйнай тэхнікі, лаўрэата Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці (2004) (г. Баранавічы; 1941)

26 **85** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА АЛЯКСЕЕВІЧА КУЛЯШОВА** (1941, Расія – 1999), артыста тэатра і кіно, народнага артыста БССР (1979)

26 **85** гадоў з дня нараджэння **ВАЛЕРЫЯ ПАЎЛАВІЧА РЫБАРАВА** (1941, Расія – 2025), кінарэжысёра, сцэнарыста, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР (1990)

27 **ДЗЕНЬ ВЫНАХОДНІКА і РАЦЫЯНАЛІЗАТАРА** *(апошняя*

субота чэрвеня)

28 **ДЗЕНЬ МОЛАДЗІ і СТУДЭНЦТВА** *(апошняя нядзеля чэрвеня)*

30 **ДЗЕНЬ ЭКАНАМІСТА**

30 **95** гадоў з дня нараджэння **РЫШАРДА ЗДЗІСЛАВАВІЧА ЯСІНСКАГА** (1931, г. Баранавічы – 2005), кінарэжысёра-дакументаліста, сцэнарыста, журналіста, лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола БССР (1974) і прэміі Міжнароднага кінафестывалю дакументальнага кіно ў г. Ліён (1973)

ЛІПЕНЬ

85 гадоў з пачатку выдання альманаха сатыры і гумару **«ВОЖЫК»**, першыя нумары якога выходзілі як агітплакат «РАЗДАВІМ ФАШЫСЦКУЮ ГАДЗІНУ» (г. Мінск; 1941–2022, як самастойнае выданне)

50 гадоў з часу адкрыцця **САНАТОРЫЯ «БЯРЭСЦЕ»** (цяпер — ААТ «БРЭСТАГРАЗДРАЎНІЦА»; пас. Бярэсце, Брэсцкі р-н; 1976)

1 **100** гадоў з часу адкрыцця першай экспазіцыі **МУЗЕЯ БЕЛАРУСКАГА ПАЛЕССЯ** (г. Пінск; 1926)

1 **85** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ УЛАДЗІМІРАВІЧА РУМАКА** (1941, в. Хойна, Пінскі р-н – 1995), прафесара, доктара тэхнічных навук, вучонага ў галіне мікраэлектронікі, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР (1984)

1 **75** гадоў з дня нараджэння **ВАЛЯНЦІНЫ МІХАЙЛАЎНЫ КРЫЛОВІЧ** (1951, Буда-Кашалёўскі р-н, Гомельская вобл.), спявачкі (сапрана), заслужанай артысткі БССР (1988)

3 **ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ** (ДЗЕНЬ РЭСПУБЛІКІ)

4 **ДЗЕНЬ КААПЕРАЦЫІ** *(першая субота ліпеня)*

5 **ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ ВОДНАГА ТРАНСПАРТУ** *(першая нядзеля ліпеня)*

5 **125** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА МІКАЛАЕВІЧА ВАРАКСІНА** (1901, Расія – 1980), архітэктара, педагога, заслужанага будаўніка БССР (1961)

6 **175** гадоў з дня нараджэння **ЯНКІ ЛУЧЫНЫ** (сапр. ІВАНА ЛЮЦЫЯНАВІЧА НЕСЛУХОЎСКАГА; 1851, г. Мінск – 1897), паэта, перакладчыка

6 **80** гадоў з часу прыняцця рашэння аб арганізацыі **КОБРЫНСКАГА ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ імя А. В. СУВОРАВА**, адкрытага для наведвальнікаў у 1947 г. (цяпер — УК «КОБРЫНСКІ ВАЕННА-ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ імя А. В. СУВОРАВА; 1946)

7 **230** гадоў з дня нараджэння **ЯНА АНТОНІ ТАДЭВУШАВІЧА**

ЧАЧОТА (1796, Карэліцкі р-н, Навагрудскі павет – 1847), паэта, драматурга, фальклярыста, этнографа, аднаго з першых збіральнікаў беларускага фальклору

7 **130** гадоў з дня нараджэння **ІВАНА ДАМІЯНАВІЧА СНІТКО** (1896, в. Хомск, Драгічынскі р-н – 1981), ваеннага дзеяча, контр-адмірала, удзельніка Першай сусветнай, Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, кавалера ордэна Леніна, Айчыннай вайны I ступені, ордэна Чырвонага Сцяга (1942, 1943, 1944), ордэна Чырвонай Зоркі (двойчы)

8 **165** гадоў з дня нараджэння **МАГДАЛЕНЫ ІВАНАЎНЫ РАДЗІВІЛ** (1861, Польшча – 1945), дзеяча беларускага культурнага руху, асветніцы, мецэнаткі, якая фінансава падтрымлівала адкрыццё школ, выданне вучэбнай літаратуры і рэлігійных кніг на беларускай мове

8 **80** гадоў з дня нараджэння **ЭЛЕАНОРЫ АРКАДЗЬЕЎНЫ ЯЗЕРСКАЙ** (1946, г. Мінск – 2014), музычнага дзеяча, актрысы, тэле- і радыёвядучай

8 **75** гадоў з дня нараджэння **ПЯТРА ПЯТРОВІЧА ЮРЧАНКОВА** (старэйшага; 1951, г. Брэст – 2013), акцёра, заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь (2011), уладальніка прыза Беларускага саюза тэатральных дзеячаў «Крыштальная зорка» (2011)

10 **155** гадоў з дня нараджэння **ПАЎЛА ПЯТРОВІЧА ДЗЕМІДОВІЧА** (1871, Стаўбцоўскі р-н, Мінская вобл. – 1931), этнографа, фальклярыста, краязнаўца і педагога

11 **115** гадоў з дня нараджэння **ЯНКІ ЧАБОРА** (сапр. ІВАНА СЦЯПАНАВІЧА ПАТАПОВІЧА; 1911, в. Рачканы, Ляхавіцкі р-н – 1943[?]), пісьменніка, публіцыста, удзельніка нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў Заходняй Беларусі

11 **90** гадоў з дня нараджэння **ЦІМОХА** (ЦІМАФЕЯ БАРЫСАВІЧА) **ЛІЯКУМОВІЧА** (1936, Калінкавіцкі р-н, Гомельская вобл.), літаратуразнаўца, пісьменніка, перакладчыка, крытыка, педагога, прафесара, доктара філалагічных навук, даследчыка праблем узаемадзеяння беларускай літаратуры з іншымі літаратурамі, пытанняў паэтычнага перакладу, дзеяча беларускага замежжа, выдатніка адукацыі Рэспублікі Беларусі (1995)

12 **ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ ПАДАТКОВЫХ ОРГАНАЎ** *(другая нядзеля ліпеня)*

12 **95** гадоў з дня нараджэння **ВЯЧАСЛАВА ГЕОРГІЕВІЧА КУБАРАВА** (1931, Расія – 1995), мастака кіно, жывапісца, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР (1981), заслужанага мастака Расійскай Федэрацыі (1999)

12 **85** гадоў з дня нараджэння **АЛЕГА ГЕОРГІЕВІЧА СЛУКІ** (1941, Асіповіцкі р-н, Магілёўская вобл.), вучонага-гісторыка, дзяржаўнага дзеяча, заслужанага журналіста Рэспублікі Беларусь,

лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола БССР (1980), выдатніка адукацыі Рэспублікі Беларусь (2001), выдатніка друку Рэспублікі Беларусь (2006)

13 **160** гадоў з дня нараджэння **НАПАЛЕОНА КАЗІМІРАВІЧА ЧАРНОЦКАГА** (1866, Ляхавіцкі р-н – 1937), публіцыста, перакладчыка, урача, рэвалюцыянера, аўтара ўспамінаў, гістарычных і фальклорных нарысаў, публіцыстычных артыкулаў

13 **85** гадоў з дня нараджэння **АНДРЭЯ ФЁДАРАВІЧА АНДРОСІКА** (1941, Расія – 2003), рэжысёра тэатра

13 **75** гадоў з дня нараджэння **ВЕРЫ ІЛЬНІЧНЫ КАВАЛЕРАВАЙ** (1951, г. Мінск), актрысы, заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь (1991), лаўрэата прэміі Беларускага саюза тэатральных дзеячаў «Крыштальная Паўлінка» (2011)

13 **65** гадоў з дня нараджэння **АЛЕГА УЛАДЗІМІРАВІЧА МЕЛЬНІКАВА** (1961, г. Мінск), артыста, опернага спевака (бас), педагога, заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь (1999)

13 **55** гадоў з дня нараджэння **АКСАНЫ МІХАЙЛАЎНЫ ГАЙДУКОВІЧ** (1971, г. Брэст), мастака ў розных жанрах станковага жывапісу

14 **115** гадоў з дня нараджэння **ПАЎЛА ІВАНАВІЧА ПРУДНІКАВА** (1911, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл. – 2000), пісьменніка, празаіка, публіцыста, заслужанага работніка культуры Рэспублікі Беларусь (1992)

14 **90** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА АНАТОЛЬЕВІЧА ПАЎЛОЎСКАГА** (1936, г. Мінск – 1977), спартсмена (фехтаванне на шпагах), заслужанага майстра спорту СССР (1960), бронзавага прызёра XVII летніх Алімпійскіх гульняў (1960), бронзавага прызёра чэмпіянату свету (1962), чэмпіёна СССР (1955, 1958, 1961, 1962)

14 **80** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ АНДРЭЕВІЧА ЦЫРЭЛЬЧУКА** (1946, в. Адрыжын, Іванаўскі р-н – 2011), вучонага ў галіне мікраэлектронікі, кандыдата тэхнічных навук, прафесара, заслужанага работніка адукацыі БССР (1991)

14 **70** гадоў з дня нараджэння **МІХАІЛА ІВАНАВІЧА ЛЯЎЧУКА** (1956, в. Малыя Зводы, Брэсцкі р-н), кандыдата тэхнічных навук, прафесара, вучонага ў галіне тэарэтычнай фізікі, лаўрэата прэміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі імя акадэміка Ф. І. Фёдарава (2011)

15 **150** гадоў з дня нараджэння **ЦЁТКІ** (сапр. АЛАІЗЫ СЦЯПАНАЎНЫ ПАШКЕВІЧ; 1876, Шчучынскі р-н, Гродзенская вобл. – 1916), грамадска-культурнай дзяячцы, пісьменніцы, асветніцы, педагога, выдаўца, удзельніцы рэвалюцыйнага руху

15 **90** гадоў з дня нараджэння **МІХАІЛА ПЯТРОВІЧА БАЛЮКА** (1936, в. Ставок, Пінскі р-н), мастака дэкаратыўна-прыкладнога

мастацтва (кераміка), медальера

15 **80** гадоў з дня нараджэння **ВІКТАРА ІВАНАВІЧА БАЗЯЛЕЎСКАГА** (1946, г. Брэст), спартсмена (акрабатыка спартыўная), майстра спорту СССР, мнагакратнага чэмпіёна і прызёра чэмпіянатаў Беларусі, трэнера, сярод выхаванцаў якога — чэмпіёнка свету А. Палявая

17 **165** гадоў з часу заснавання **ГРОДЗЕНСКАЙ ТЫТУНЁВАЙ ФАБРЫКІ «НЁМАН»** (1861), адкрытага акцыянернага таварыства ў складзе канцэрна «Белдзяржхарчпрам»

18 **80** гадоў з дня нараджэння **АНДРЭЯ АЛЯКСЕЕВІЧА КАЛЯДЫ** (1946, в. Рубель, Столінскі р-н), вучонага ў галіне камп'ютарнай алгебры, інфарматыкі і кібернетыкі, доктара фізіка-матэматычных навук, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР (1991)

18 **75** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСЕЯ РАМАНАВІЧА БАЕВА** (1951, г. Баранавічы), вучонага-фізіка, доктара тэхнічных навук, прафесара

19 **ДЗЕНЬ МЕТАЛУРГА** *(трэцяя нядзеля ліпеня)*

20 **120** гадоў з дня нараджэння **ІЛЛІ ПАЎЛАВІЧА МАЗУРУКА** (1906, г. Брэст – 1989), ваеннага дзеяча, генерал-маёра авіяцыі, заслужанага палярнага лётчыка, удзельніка Савецка-фінляндскай і Вялікай Айчыннай войнаў, Героя Савецкага Саюза (1937)

20 **90** гадоў з дня нараджэння **ВІКТАРА ПЯТРОВІЧА КРАСНЕЯ** (1936, в. Хамічы, Бярозаўскі р-н – 2016), мовазнаўца, педагога, кандыдата філалагічных навук, выдатніка адукацыі Рэспублікі Беларусь, даследчыка праблем лексікалогіі, тэрміналогіі, стылістыкі, гісторыі беларускай літаратурнай мовы

20 **95** гадоў з дня нараджэння **ГАЯ дэ ПІКАРДА** (1931, Вялікабрытанія – 2007), даследчыка беларускай культуры, жыцця і дзейнасці Францыска Скарыны, музыказнаўца

21 **245** гадоў з дня нараджэння **АНТОНА** (АНТОНІЯ) **МАРЦІНОЎСКАГА** (1781, Маладзечанскі р-н, Мінская вобл. – 1855), рэдактара-выдаўца, публіцыста, заснавальніка Віленскай друкарні (1817)

23 **130** гадоў з дня нараджэння **АНТОНА МІХАЙЛАВІЧА ВАЛЫНЧЫКА** (1896, Слонімскі р-н, Гродзенская вобл. – 1985), харавога дырыжора, кампазітара, музычнага дзеяча, заслужанага дзеяча культуры БССР (1964)

23 **85** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА РЫГОРАВІЧА ІВАНЮКА** (1941, в. Мяфёдавічы, Кобрынскі р-н – 2009), прафесара, доктара біялагічных навук, вучонага ў галіне аховы раслін, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Акадэміі аграрных навук Беларусі

23 **55** гадоў з дня нараджэння **ПАЎЛА ЮР'ЕВІЧА ТАТАРНІКАВА** (1971, г. Брэст), мастака, кніжнага графіка, лаўрэата Дзяржаўнай

прэміі Рэспублікі Беларусь (2010)

24 **115** гадоў з дня нараджэння **АНАТОЛЯ** (АКІМА ПЯТРОВІЧА) **АСТРЭЙКІ** (1911, Капыльскі р-н, Мінская вобл. – 1978), паэта, перакладчыка

24 **75** гадоў з дня нараджэння **ІВАНА ІВАНАВІЧА РУМАЧЫКА** (1951, в. Валавель, Драгічынскі р-н), вучонага ў галіне ветэрынарнай мікрабіялогіі, вірусалогіі, доктара ветэрынарных навук

24 **50** гадоў з дня нараджэння **ВОЛЬГІ МІКАЛАЕЎНЫ ПАПКО** (1976, г. Брэст), вучонага-гісторыка, кандыдата гістарычных навук, дацэнта, аўтара прац па праблемах дзяржаўнай палітыкі Беларусі ў галіне прафесійнай мастацкай культуры, гісторыі беларускай шляхты ў XIX ст.

25 **ДЗЕНЬ ПАЖАРНАЙ СЛУЖБЫ**

25 **75** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА ПАЎЛАВІЧА КСЯНДЗОВА** (1951, в. Чарнаўчыцы, Брэсцкі р-н – 2002), доктара гістарычных навук, вучонага-археолага, які займаўся даследаваннем помнікаў палеаліту і мезаліту на тэрыторыі беларускага Падняпроўя і басейна Заходняй Дзвіны

26 **ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ ГАНДЛЮ** *(апошняя нядзеля ліпеня)*

27 **130** гадоў з дня нараджэння **ЯЗЭПА МІХАЙЛАВІЧА ГОРЫДА** (1896, Украіна – 1939), графіка, жывапісца ў сферы палітычнай і бытавой карыкатуры, сатырычнага малюнка, кніжнай графікі, аўтара партрэтаў, пейзажаў

27 **130** гадоў з дня нараджэння **ЛЬВА МІХАЙЛАВІЧА КРАМАРЭЎСКАГА** (1896, Украіна – 1976), балетмайстра-харэографа, педагога-рэпетытара Вялікага тэатра СССР, чыя пастаноўка балета Р. Гліэра «Чырвоны мак» (1933) дала пачатак балетнаму рэпертуару Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь

27 **120** гадоў з дня нараджэння **ЕЖЫ ГЕДРОЙЦА** (1906, г. Мінск – 2000), палітыка, публіцыста, мемуарыста, выдаўца, культурнага дзеяча, частка асабістай бібліятэкі якога захоўваецца ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

29 **75** гадоў з дня нараджэння **ЯЎГЕНА АНДРЭЕВІЧА ГАРАДНІЦКАГА** (1951, Валожынскі р-н, Мінская вобл.), філолага, доктара філалагічных навук, дацэнта, літаратуразнаўца, крытыка, паэта, лаўрэата Прэміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (2013)

ЖНІВЕНЬ

55 гадоў з часу адкрыцця ў г. Брэсце **ГАСЦІНІЦЫ «БЕЛАРУСЬ»** (1971)

1 **105** гадоў з дня нараджэння **ПЯТРА ЛУК'ЯНАВІЧА ГРЫШЧАНКІ** (1921, Віцебскі р-н – 1973), удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, Героя Савецкага Саюза (1944)

1 **80** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ СЯРГЕЕВІЧА ГІРГЕЛЯ** (1946, Міёрскі р-н, Віцебская вобл.), мастака, графіка, лаўрэата прэміі імя К. Крапівы (2006)

1 **75** гадоў з дня нараджэння **АЛЫ АЛЯКСЕЕЎНЫ САВІЦКАЙ** (1951, г. Мінск), тэатразнаўца, даследчыка гісторыі беларускага тэатра, беларускай драматургіі, кандыдата мастацтвазнаўства

2 **ДЗЕНЬ ЧЫГУНАЧНІКА** *(першая нядзеля жніўня)*

2 **ДЗЕНЬ ДЭСАНТНІКАЎ і СІЛ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ АПЕРАЦЫЙ**

2 **145** гадоў з дня нараджэння **СТАНІСЛАВА ВІНЦЭНТАВІЧА КАЗУРЫ** (1881, Пастаўскі р-н, Віцебская вобл. – 1961), кампазітара, харавога дырыжора, педагога, збіральніка і аўтара апрацовак беларускіх народных песень

2 **75** гадоў з дня нараджэння **ЗІНАІДЫ ВІКТАРАЎНЫ ВЯРЖБІЦКАЙ** (1951, Расія), артысткі аперэты, заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь (1998)

3 **100** гадоў з дня нараджэння **АЛЕСЯ** (АЛЯКСАНДРА МІХАЙЛАВІЧА) **АДАМОВІЧА** (1926 [па дакументах 03.09.1927], Капыльскі р-н , Мінская вобл. – 1994), пісьменніка, крытыка, літаратуразнаўца, доктара філалагічных навук, прафесара, грамадскага дзеяча, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, лаўрэата прэміі Міністэрства абароны СССР (1974), Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1976), кавалера ордэна «Знак Пашаны» (1977)

3 **95** гадоў з часу зацвярджэння **БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ГЛУХІХ**, грамадскага аб'яднання (г. Мінск; 1931)

4 **80** гадоў з дня нараджэння **ВІКТОРЫІ МІКАЛАЕЎНЫ МАЗУР** (1946, г. Магілёў – 2015), артысткі аперэты (сапрана), заслужанай артысткі БССР (1982), народнай артысткі Рэспублікі Беларусь (1998)

5 **130** гадоў з дня нараджэння **ЛЕАНІДА АЛЯКСЕЕВІЧА МАРКЕВІЧА** (1896, г. Вільня – 1980), кампазітара, дырыжора, заслужанага артыста БССР (1944)

5 **95** гадоў з дня нараджэння **ПАЎЛА КУЗЬМІЧА ДЗЮБАЙЛЫ** (1931, Бярэзінскі р-н, Мінская вобл. – 1995), крытыка, літаратуразнаўца, доктара філалагічных навук, прафесара, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1980)

5 **80** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА АНДРЭЕВІЧА МІШЧАНЧУКА** (1946, в. Валавель, Драгічынскі р-н), акцёра тэатра і кіно, педагога, прафесара, заслужанага артыста БССР (1977), лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі

Беларусь «За духоўнае адраджэнне» (2012), кавалера ордэна Францыска Скарыны (2011)

6 **ДЗЕНЬ ЧЫГУНАЧНЫХ ВОЙСКАЎ**

6 **90** гадоў з дня нараджэння **ПЯТРА АЛЯКСАНДРАВІЧА ВІЦЯЗЯ** (1936, в. Першамайская, Бярозаўскі р-н), вучонага ў галіне распрацоўкі новых матэрыялаў, тэхналогій і машынабудавання, доктара тэхнічных навук, прафесара, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Акадэміі ваенных навук Расіі, заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь (1991), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР (1980), прэміі Савета Міністраў СССР (1976), прэміі акадэмій навук Украіны, Беларусі і Малдовы (2007)

6 **80** гадоў з дня нараджэння **ВАЛЯНЦІНЫ ІВАНАЎНЫ ЛОКУН** (1946, в. Цепянец, Пінскі р-н – 2016), літаратуразнаўца, крытыка, пісьменніка, кандыдата філалагічных навук, лаўрэата прэміі Прэзідэнтаў акадэмій навук Украіны, Беларусі і Малдовы (2004), двойчы лаўрэата прэміі часопіса «Полымя» (1993, 2001), уладальніка медаля Святой Ефрасінні Полацкай (2006)

6 **40** гадоў з часу заснавання **БРЭСЦКАЙ АБЛАСНОЙ ФІЛАРМОНІІ**, дзяржаўнай установы (г. Брэст; 1986)

8 **70** гадоў з дня нараджэння **МІХАІЛА ІВАНАВІЧА КУЛЕШЫ** (1956, Іванаўскі р-н), паэта, празаіка, перакладчыка

9 **ДЗЕНЬ БУДАЎНІКА** *(другая нядзеля жніўня)*

9 **90** гадоў з дня нараджэння **ЯЎГЕНА ВАСІЛЬЕВІЧА МІКЛАШЭЎСКАГА** (1936, Польшча – 2010), пісьменніка, перакладчыка, драматурга, лаўрэата Літаратурнай прэміі імя І. Мележа (1996)

10 **85** гадоў з дня нараджэння **ЮРЫЯ ІВАНАВІЧА ТАТАРНІКАВА** (1941, Расія – 2005), мастака, які працаваў у станковым жывапісе і акварэлі, педагога, дацэнта, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (2011)

10 **60** гадоў з часу стварэння **БРЭСЦКАГА ЭЛЕКТРАЛЯМПАВАГА ЗАВОДА** (1966), адкрытага акцыянернага таварыства ў складзе холдынга «Гарызонт» па вырабе лямпаў напальвання агульнага і спецыяльнага прызначэння

11 **105** гадоў з дня нараджэння **ЯЎГЕНІЯ СЦЯПАНАВІЧА ПАРФЕНЮКА** (1921, в. Лядавічы, Іванаўскі р-н – 2008), царкоўнага дзеяча Брэсцкага благачыннага, кандыдата багаслоўя, члена Фонду міру, лаўрэата прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» (2000), удзельніка Вялікай Айчыннай вайны

11 **80** гадоў з дня нараджэння **ВІКТАРА МІКАЛАЕВІЧА НАВУМЧЫКА** (1946, г. Брэст), вучонага ў галіне педагогікі,

доктара педагагічных навук, прафесара, выдатніка асветы СССР, вынаходніка СССР, аўтара прац па праблемах педагогікі, методыкі выкладання фізікі, педагагічнай эргаломікі, педагагічнай этыкі

13 **60** гадоў з часу спуску на воду танкера **«ГЕРОИ БРЕСТА»** (1966) на Балтыйскім суднабудаўнічым заводзе імя С. Арджанікідзэ

14 **110** гадоў з дня нараджэння **ФЁДАРА ІВАНАВІЧА ЛІСОВІЧА** (1916, Жыткавіцкі р-н, Гомельская вобл. – 1972), аднаго з кіраўнікоў партызанскага руху ў Пінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, кавалера ордэна Чырвонага Сцяга, ордэна Айчыннай вайны I ступені

14 **90** гадоў з дня нараджэння **ІВАНА СЦЯПАНАВІЧА ШПАКОЎСКАГА** (1936, в. Мясяцічы, Пінскі р-н), літаратуразнаўца, крытыка, дацэнта, кандыдата філалагічных навук, даследчыка праблем тэорыі літаратуры

15 **195** гадоў з дня нараджэння **ВІНЦЭСЯ АЛЯКСАНДРАВІЧА КАРАТЫНСКАГА** (1831, Карэліцкі р-н, Гродзенская вобл. – 1891), паэта, публіцыста, перакладчыка

15 **90** гадоў з часу правядзення **ПЕРШАГА ПАЛЕСКАГА КІРМАШУ** (г. Пінск; 1936)

15 **85** гадоў з дня нараджэння **ТАЦЦЯНЫ ВЯЧАСЛАВАЎНЫ КАБРЖЫЦКАЙ** (1941, Украіна), літаратуразнаўца, крытыка, перакладчыка, краязнаўца, кандыдата філалагічных навук, аўтара шматлікіх артыкулаў і рэцэнзій па пытаннях методыкі выкладання, тэорыі і гісторыі літаратуры, узаемадзеяння ўсходнеславянскіх літаратур

15 **35** гадоў з часу стварэння рэспубліканскага біялагічнага заказніка **СПОРАЎСКІ** (Івацэвіцкі, Іванаўскі, Бярозаўскі і Драгічынскі р-ны; 1991)

16 **ДЗЕНЬ ВАЕННА-ПАВЕТРАНЫХ СІЛ** *(трэцяя нядзеля жніўня)*

16 **115** гадоў з дня нараджэння **АНДРЭЯ АЛЯКСЕЕВІЧА ТРАФІМУКА** (1911, в. Федзькавічы, Жабінкаўскі р-н – 1999), вучонага-геолага, спецыяліста ў галіне геалогіі і разведкі нафтавых і газавых радовішчаў, доктара геолага-мінералагічных навук, дзяржаўнага і грамадскага дзеяча, акадэміка Акадэміі навук СССР, Героя Сацыялістычнай Працы (1944), заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі РСФСР

16 **85** гадоў з дня нараджэння **СВЯТЛАНЫ СЯРГЕЕЎНЫ КАТКОВАЙ** (1941, Расія – 2020), мастака манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, жывапісца, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (2010)

16 **65** гадоў з дня нараджэння **РАМАНА СЦЯПАНАВІЧА МАТУЛЬСКАГА** (1961, Украіна), вучонага ў галіне бібліятэказнаўства, доктара педагагічных навук, прафесара, заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь (2013),

